

ШТРЫХІ ДА «НОВАЙ ЗЯМЛІ» 8

ЧАМУ РАЗГАРНУЛАСЯ ГЛАБАЛЬНАЯ ХВАЛЯ СПЁКІ? 11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

22 ЛІПЕНЯ 2023 г. СУБОТА № 140 (30020)

## КОРАТКА

• Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін правядуць перагаворы 23 ліпеня.

• **Аляксандр Лукашэнка 21 ліпеня падпісаў Указ № 222, якім зацверджаны тэкст прысягі грамадзяніна Рэспублікі Беларусь і парадак яе прынясення асобамі, якія сталі грамадзянамі Беларусі.**

• Беларусь мае намер павялічваць пастаўкі прадуктаў харчавання ў Кітай.

• **Каля Br3,8 млн матдапамогі будзе выплачана шматдзетным сем'ям Мінска да новага навучальнага года.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Алег КОТ, намеснік міністра юстыцыі:**

*«Сёння простыя і ўсім зразумелыя словы «мір» і «стварэнне» напаўняюцца асаблівым сэнсам, зместам і стаўленнем. Ключавымі сёлета з'яўляюцца мерапрыемствы, накіраваныя на ўдасканаленне сістэмы ваенна-патрыятычнага выхавання, прасоўванне мірных ініцыятыў грамадскасці, садзейнічанне міжканфесіянальнаму дыялогу, які забяспечвае мір і згоду ў беларускім грамадстве, дэманстрацыю пераваг беларускай эканамічнай мадэлі ва ўмовах глабальнай турбулентнасці. Такая тэматыка дазваляе ўмацаваць успрымание Беларусі як астраўка міру, бясспрэчная каштоўнасць якога для нас з'яўляецца важкім аргументам у дасягненні згоды па іншых найважнейшых пытаннях грамадскага жыцця. Беларускім адказам на мілітарызацыю ў Еўрапейскім рэгіёне стане мірная і стваральная праца суайчыннікаў».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ЖНІВО — ПЫТАННЕ НУМАР АДЗІН, МОМАНТ ІСЦІНЫ І ФІНІШ ВЯЛІКАЙ РАБОТЫ»

## Пытанні, даклады, даручэнні — дэталі селектарнай нарады

**Праблемы, планы і мэты сёлетняй уборачнай кампаніі абмеркавалі на селектарнай нарадзе з удзелам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Сустрэча ў такім фармаце ў гэтую пару года ўжо стала традыцыйнай. Па словах кіраўніка дзяржавы, такі фармат дазваляе ўбачыць сітуацыю на месцах, усе поспехі і недахопы ў рэжыме рэальнага часу. Таму і размова атрымалася шчырай, але ў той жа час жорсткай. А самае галоўнае — прынцыповай і канкрэтнай.**



Фота БелТА

«Жніво — заўсёды пытанне нумар адзін. Па сутнасці, момант ісціны і фініш вялікай работы ўсяго аграпрамысловага комплексу на працягу сельскагаспадарчага года», — заўважыў Прэзідэнт.

Удзел у селектарнай нарадзе ўзялі члены ўрада, вышэйшыя службовыя асобы і губернатары ўсіх абласцей. «Я вас запрасіў у такім складзе на селектарную нараду ў сувязі з тым, што, шчыра кажучы, у мяне ёсць апасенні з расслабленнем кадраў у сувязі з умовамі надвор'я», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, што ў Беларусі часта бывае, калі працяглая засуха змяняецца дажджлівай пагодай. «Майце на ўвазе, так можа быць, а хутчэй за ўсё, так будзе сёлета. Пасля гэтай засухі можа быць вельмі сырое і дажджлівае надвор'е ў жніўні. І тады мы яшчэ недаатрымаем ураджай з-за сваёй неарганізаванасці ў сувязі з вільготным надвор'ем», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Для таго каб забяспечыць уласную харчовую бяспеку, каб на стале ў нас, як кажуць у народзе, быў «і хлеб, і да хлеба», каб пераапрацоўшчыкі былі забяспечаныя сыравінай, а жывёлагадоўля — кармамі, цяпер усім трэба максімальна арганізавацца. Уборачная — гэта, калі хочаце, наш харчовы фронт. А на вайне, як на вайне. Перамагае той, хто лепш падрыхтаваны. Хто задзейнічаў усе рэсурсы і вае ад змяркання да змяркання. Як я часта кажу, лепш на гэтым фронце ваяваць, чым на гарачым», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах Прэзідэнта, трэба шчыра адказаць на пытанне, дзе мы спраўляемся, а дзе недапрацоўваем. І тэрмінова ўсе недахопы выправіць. Ён нагадаў, што рыхтавацца да ўборачнай кампаніі пачалі з восені мінулага года. Наведвалі рэгіёны, высвятлялі, якія ёсць праблемы, дзе патрэбныя дапамога дзяржавы і прамое ўмяшанне Прэзідэнта.

«Усе вашы пажаданні па дапамозе вёсцы, па падтрымцы сельскагаспадарчага комплексу мною падтрыманы. Неабходныя рашэнні па выдзяленні бюджэтных крэдытаў на закупку мінеральных угнаенняў, гаруча-змазачных матэрыялаў, рамонт тэхнікі прынятыя. Такім чынам, у мяне ёсць поўнае права патрабаваць, прычым максімальна жорстка, высокіх вынікаў і аддачы. Тым больш практыка мінулага года паказала, што нашым сельгасарганізацыям пад сілу збіраць дастойныя ўраджаі», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2

Напярэдадні

# БАКСЁРСКІ РЫНГ У АМФІТЭАТРЫ

## Віцебшчына рыхтуецца да спаборніцтваў ІІ Гульняў краін СНД



**Не паспелі адгрымець пазыўныя XXXII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», як горад ужо рыхтуецца ўключаць фанфары ў гонар герояў спорту. З 4 да 14 жніўня паўночны рэгіён прымае спаборніцтвы ў рамках ІІ Гульняў краін СНД.**

СТАР. 12

Па палічках

# ЯК ПАБУДАВАЦЬ ПРЫВАТНЫ ДОМ?

## Цяпер гэта можна зрабіць самастойна з мінімумам дакументаў або заказаць «пад ключ»

**Ужо больш за паўгода дзейнічае Указ Прэзідэнта № 202 «Аб спрошчаным парадку ўзвядзення і рэканструкцыі аб'ектаў будаўніцтва», які значна палягчае ўзвядзенне прыватных дамоў за межамі Мінска. Раней неабходна было падрыхтаваць мноства дазволаў і ўзгадненняў, а цяпер дастаткова аднаго дакумента. Якія сёння існуюць магчымасці па будаўніцтве індывідуальнага жылля? Кампетэнтныя эксперты распавялі пра спрошчаны парадак індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва і правілы ўзвядзення аб'ектаў.**

СТАР. 7



ISSN 1990 — 763X

# «ЖНІВО — ПЫТАННЕ НУМАР АДЗІН,

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Летась беларускія аграрыі сабралі звыш дзесяці мільёнаў тон збожжа. Прэзідэнт нагадаў, што сёлета ім была пастаўлена задача замацавацца прыкладна на ўзроўні 9,5 — 10 млн т. Але, як запэўніваюць спецыялісты і ўрад, якія зноў наракаюць на надвор'е, колас сёлета лягчэйшы на 10-15 працэнтаў і прагназуемы валавы збор збожжа (уключаючы рапс, кукурузу, свірэпіцу) складзе дзевяць мільёнаў тон. Гэта менш за ўзровень мінулага года. «І гэта тое, што цяпер знаходзіцца на корані. Што трэба яшчэ без страт убраць і адправіць у сховішчы? Урад запэўнівае, такой колькасці нам амаль хопіць для забеспячэння краіны харчовым і фуражным зернем. Я ў гэтым абсалютна не сумняваюся», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што рашэнне па закупцы пэўнай колькасці збожжа ў Расіі прынятае. Яго цана блізкая да сабекошту нашага збожжа. Таму і было прынята рашэнне купіць збожжа цяпер, пакуль яно таннае. Прэзідэнт пацікавіўся, што зроблена ў вырашэнні дадзенага пытання. «Паўтару сказанае ў Оршы. Збожжа сёння падобнае да золатавалютных рэзерваў. Заўсёды спатрэбіцца і ўвесь час расце ў цане. Прынамсі, такіх цэн на міжнародным рынку, як учора і сёння, не было і не будзе. Гэта дакладна. І калі ў нас ёсць свабодныя магутнасці, чаму б іх не запоўніць рэзервам збожжа?» — сказаў беларускі лідар.

## «ВАША ПРАЦОЎНАЕ МЕСЦА НЕ КАБІНЕТ, А ЭЛЕВАТАР»

Пільную ўвагу Прэзідэнт звярнуў на праблемы. Камітэт дзяржаўнага кантролю, Генеральная пракуратура і Міністэрства ўнутраных спраў дакладваюць, што сітуацыя далёкая не тое што ад ідэальнай, а ад нармальнай. Асноўныя прэтэнзіі кантралёраў — нізкая гатоўнасць збожжаўборачнай тэхнікі, элеватараў, сховішчаў і праблемы з механізатарскімі кадрамі. Таксама, згодна з дакладамі кантралёраў, камбайны не гатовыя да работы практычна ў кожнай другой з правераных гаспадарак краіны.

Прэзідэнт звярнуў увагу і на «адвечную хваробу аграрыяў» — прыпіскі. Па краіне пракуратура ўстанавіла 185 такіх выпадкаў, калі тэхніка была гатовая да работы толькі на паперы. «Вось гэтага дараваць ніколі нельга. Такія гора-кіраўнікі нас завядуць чорт ведае куды. 33 зернеачышчальна-сушыльных комплексы таксама былі не гатовыя», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, больш за ўсё такіх абуральных фактаў выяўлена ў Мінскай (77), Гродзенскай (52) і Віцебскай абласцях (42). «Не ведаю, навошта тое ашуканства, каго вы спрабуеце падмануць? Замест таго каб звярнуцца па дапамогу, спрабуеце схаваць праблему. А вынік — няўбраны ўраджай і страты ўсёй дзяржавы», — заўважыў Прэзідэнт.

Яшчэ адна сістэмная праблема — адсутнасць тэхагляду. Да пачатку ўборачных работ яго не прайшлі ў Гомельскай вобласці 63 працэнты камбайнаў, Віцебскай — палова, Магілёўскай — 36 працэнтаў. «Нядзіўна, што потым нагрузка на адзін працоўны камбайн складае не 273, як у сярэднім па краіне, выходзячы з наяўнасці тэхнікі, а звыш 500 гектараў, а ў некаторых да 900 гектараў (асобныя гаспадаркі Барысаўскага раёна). Пра якую якасць уборкі тады мы можам казаць? І дзе гэта наша арганізаванасць?» — запытаў кіраўнік дзяржавы.



Прэзідэнт нагадаў, што год таму было дадзена даручэнне закупіць для ўсіх рэгіёнаў каля 600 новых зернеўборачных камбайнаў, была выпрацавана і адобрана аптымальная схема іх закупкі. «І губернатары крыўдзяцца: на 17 ліпеня вяскоўцы атрымалі толькі 425 адзінак тэхнікі. Слухайце, навошта вам новую тэхніку даваць, калі вы не адрамантавалі тую, што ёсць? Што гэта за падыходы такія? Прэм'ер-міністру і ўраду трэба разабрацца, каму мы можам тую тэхніку даваць, а каму — не. Таму што гэта яшчэ і падарунак якісьці ад дзяржавы. Калі б за свае грошы куплялі — калі ласка. Дык сёння просяць тэхніку, а заўтра прыходзяць па грошы. А ў той жа час у заплоцці стаіць тэхніка, якая не адрамантаваная. Разбярыцеся з гэтым, Раман Аляксандравіч (прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка. — **Заўв. аўт.**). Пара ўжо пераходзіць ад балбатні і заклінанняў да канкрэтных мер», — сказаў Прэзідэнт.

Ён зрабіў акцэнт на тым, што жніво толькі пачалося, а кантралёрамі ўжо выяўлены факты няякаснай уборкі ўраджаю і наплявацельскага стаўлення да яго захаванасці. «Недапушчальна», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. Адзначаюцца праблемы і з нарыхтоўкай кармоў. Прычыны тыя ж — няспраўная тэхніка, парушэнне тэхналагічных рэгламентаў і працоўнай дысцыпліны. І яшчэ, што больш дзіўна, на 10 ліпеня ў 14 гаспадарках Глыбоцкага, Аршанскага і Лепельскага раёнаў Віцебскай вобласці не завершаны першы ўкос шматгадовай травы.

Самай брыдкай праблемай кіраўнік дзяржавы назваў крадзеж і п'янства. Жніво толькі пачалося, а МУС за крадзяжы гаруча-змазачных матэрыялаў і збожжа распачата 61 крымінальная справа і выяўлена амаль 2200 адміністрацыйных правапарушэнняў.

«З году ў год не можам перамагчы адны і тыя ж праблемы. Дзе кіраўніцтва абласцей, раёнаў, арганізацый? Падчас уборачнай ваша працоўнае месца — не кабінет, а поле, элеватар, сховішча», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

## КЛЮЧАВЫЯ ПЫТАННІ

Першае — якая абстаноўка з уборкай на сённяшні дзень? Аляксандр Лукашэнка спытаў, якія відаць перспектывы. Ён таксама пацікавіўся, ці засталіся нявырашаныя пытанні, у тым ліку адносна збожжаўборачнай тэхнікі?

Другое — у якім стане зернеачышчальна-сушыльныя комплексы? Па словах кіраўніка дзяржавы, неабходна задзейнічаць вытворчыя магутнасці камбінатаў хлебапрадуктаў, яны павінны арганізаваць прыёмку і дапрацоўку збожжа кругласутачна.

«Яшчэ раз падкрэсліваю, калі будуць свабодныя сховішчы, іх трэба запоўніць танным пакупным збожжам», — адзначыў Прэзідэнт.

Трэцяе, дзяржзаказ на зерне жалезна павінен быць выкананы. Такую задачу паставіў Аляксандр Лукашэнка. «Гэта наш харчовы залаты запас. Я не сумняваюся, што мы выканаем дзяржзаказ. Ён не такі вялікі», — падкрэсліў беларускі лідар.

Чацвёртае — забяспечанасць працоўнымі рэсурсамі. «Уборка хлеба — справа ўсенародная. Як паведамляюць, запланавана прыцягнуць дадаткова тры тысячы механізатараў, як і летась. Гэта няшмат, калі ўзяць усе фермерскія гаспадаркі, атрымліваецца адзін чалавек на адну гаспадарку. Разам з прамысловымі прадпрыемствамі няхай губернатары прадставяць планы, адкуль каго яны возьмуць. Не павінна быць недахопу ў спецвопратцы і паўнавартаснай гарачай ежы ў полі. Людзей трэба накарміць своечасова», — сказаў кіраўнік дзяржавы.



Пятае, па словах Аляксандра Лукашэнкі, самае важнае — парадак і дысцыпліна. «МУС і МНС павінны забяспечыць абарону палёў і людзей ад пажараў. Сачыць за тым, каб не загарэлася ўборачная і зернесушыльная тэхніка», — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы.

Шостае — дапамога тым, хто жыве на прыватных падворках. «Там каля 30 тысяч гектараў засеяна збожжавымі культурамі. Асаблівая ўвага — пажылым і адзінокім вяскоўцам. Лішкі збожжа закупяць камбінаты хлебапрадуктаў», — сказаў Прэзідэнт.

Сёмае — работа сродкаў масавай інфармацыі. Аляксандр Лукашэнка заявіў, што перадавікі жніва — сапраўдныя героі нашага часу. «Яны вартыя таго, каб імі ганарылася і на іх раўнялася ўся краіна. Я бачу, такая работа пачалася, трэба яе пашыраць і паглыбляць», — адзначыў ён.

Прэзідэнт параіў разлічваць сілы і рэсурсы. «Узровень арганізацыі працы і працоўнай дысцыпліны павінен быць узорам. Вы бачыце, што адбываецца навокал. Часта вас прашу і часта вам нагадваю — галоўнае для таго, каб быў мір і спакой, гэта эканоміка. Ніхто нікому не дапаможа», — адзначыў ён.

## «ЛЕПШ ВАЯВАЦЬ У ПОЛІ»

Кіраўнікі органаў, што кантралююць ход правядзення ўборачнай кампаніі, далажылі пра яе асноўныя негатыўныя тэндэнцыі. Аляксандр Лукашэнка запытаўся, якія вобласці вылікаюць найбольшую насцярожанасць. Адказваючы на пытанне, генеральны пракурор Андрэй Швед сказаў, што сёння такую насцярожанасць выклікаюць Гомельская і Віцебская вобласці. «І па гатоўнасці ў правядзенні работ, звязаных з уборкай ураджаю, і ў тым, што датычыцца ўтрымання буйной рагатай жывёлы. Тут у нас ёсць сур'ёзныя прэтэнзіі. Калі ў іншых рэгіёнах ёсць станоўчыя тэндэнцыі, то на Віцебшчыне, на жаль, тэндэнцыю з падзяжом буйной рагатай жывёлы пераламаць да гэтага часу не ўдалося», — далажыў генпракурор. Прэзідэнт адзначыў, што тэма жывёлагадоўлі будзе асобна разглядацца падчас адпаведнага семінара, які адбудзецца ў хуткім часе. Наконт сітуацыі ў Гомельскай вобласці кіраўнік дзяржавы паставіў прынцыповае пытанне перад адказным за Гомельскую вобласць кіраўніком спраў Прэзідэнта Юрыем Назаравым. Прэзідэнт звярнуў увагу на яшчэ адно прынцыповае і актуальнае пытанне — своечасовасць выплаты заработнай платы. У цэлым праблем тут няма, але нават адзінкавыя факты недапушчальныя.

Генеральны пракурор таксама звярнуў увагу і на іншыя недахопы. Асноўныя — прыпіскі, пытанні да захаванасці ўраджаю, прастоі і несвоечасовы рамонт тэхнікі, ігнараванне нормаў пажарнай бяспекі, кадравыя пытанні. Пра пералічаныя праблемы ў сваім дакладзе казаў і старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Васіль Герасімаў. Асобна ён засяродзіў увагу на шматлікіх фактах, калі механізатары і іх памочнікі, якія прыцягваюцца з іншых арганізацый, не прыбываюць да месца работы ў сельгасарганізацыях. Спісы гэтых людзей у сельгаспрадпрыемствах вядомыя. Прэзідэнт даручыў разабрацца, чаму людзі не прыбываюць на свае рабочыя месцы. Ён зрабіў акцэнт на тым, што выканальніцкая дысцыпліна — гэта галоўнае, і даручыў навесці ў сельгасарганізацыях жалезны парадак па кадравым пытанні. «Яшчэ раз кажу: лепш ваяваць у полі, чым на фронце! Няўжо камусьці гэта не зразумела?» — абурыўся кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што калі ад гаспадарак ёсць аддача — іх будуць крэдытаваць і падтрымліваць. А калі аддачы няма, то і ніякіх размоў быць не можа. Па словах Прэзідэнта, усе неабходныя рашэнні па кадрах прынятыя.

У сваім дакладзе Васіль Герасімаў закрануў у тым ліку праблему негатоўнасці тэхнікі да работы або адсутнасці ў машын тэхнічнага агляду. Прэзідэнт пацікавіўся, якая з тым сітуацыя ў Мінскай вобласці. Старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр Турчын далажыў, што з 1700 камбайнаў няспраўныя на гэты момант 16, аднак ёсць і тыя, якія пакуль не прайшлі тэхагляд. Кіраўнік дзяржавы ўсумніўся, наколькі аб'ектыўная такая карціна, даручыўшы праверыць і далажыць сітуацыю на працягу тыдня.

Прэзідэнт падкрэсліў, што тэхнічны агляд камбайнаў і іншай тэхнікі — сведчанне таго, што гэтая тэхніка спраўная. Усё астатняе не прымаецца. Таму патрабаванне праходзіць тэхагляд павінна выконвацца жалезна.

Прэзідэнт спытаў у міністра прамысловасці Аляксандра Рагожніка, чаму, паводле звестак кантралюючых органаў, у асобных гаспадарках фіксуюцца факты няспраўнасці айчыннай тэхнікі. Міністр запэўніў, што з такімі фактамі разбярэцца. Па яго словах, тэхніка вырабляецца з дастатковым узроўнем надзейнасці. У сваю чаргу, Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся, што значэнне мае не толькі якасць вырабу тэхнікі, але і ўмовы яе эксплуатацыі, абслугоўвання. А гэта залежыць ад таго, хто сядзіць за рулём. Прэзідэнт падкрэсліў, што якасць тэхнікі, якая пастаўляецца на экспарт, і той, якая прадаецца ўнутры краіны, павінна быць, безумоўна, аднолькава добрай. Ён даручыў разабрацца з дадзеным пытаннем.

Міністр фінансаў Юрый Селіверстаў далажыў аб стане спраў з разлікамі сельгасарганізацый за паліва і іншую прадукцыю, неабходную для падрыхтоўкі і правядзення ўборачнай кампаніі. Гаворка ішла таксама аб своечасовасці пагашэння крэдытных абавязацельстваў. «Калі ў доўг узяў, трэба своечасова вярнуць. Толькі тады можна прыйсці (гэта як выключэнне) папрасіць пазычыць грошай», — папярэдзіў Прэзідэнт.

## «АДСТУПАЦЬ НЯМА КУДЫ!»

Падчас селектара кожны губернатар далажыў пра сітуацыю ў сваёй вобласці. Прэзідэнт запатрабаваў не рабіць прагнозаў і справаздач. Акцэнт — на праблемах і недахопах.

Першы адказ трымаў старшыня Брэсцкага аблвыканкама. Гэтая вобласць раней за ўсіх пачала ўборку ўраджаю. Рэгіёну пашанцавала, сёння ў яго сітуацыя лепшая, чым у цэлым па краіне. Юрый Шулейка далажыў, што на Брэстчыне ўбрана 12 працэнтаў плошчаў, сярэдняя ўраджайнасць — на ўзроўні 41 ц/га, што адпавядае ўзроўню мінулага года. Больш высокую ўраджайнасць, чым гадам раней, паказвае рапс — 30 ц/га ў параўнанні з 24 ц/га. «Мы мяркуем намалаціць без грэчкі, кукурузы і проса 1,25 млн т, што адпавядае сярэднестатыстычнаму па Брэстчыне», — сказаў губернатар. Ён таксама адзначыў, што вобласці ўдалося выйсці на ўзровень мінулага года па нарыхтоўцы кармоў.

Аляксандр Лукашэнка асобна спытаў, ці ёсць праблемы з разлікамі за пастаўленае ў лік дзяржзаказу збожжа, ці фіксаваліся факты, калі збожжа забіралі ў сельгасарганізацыях без свое-

# МОМАНТ ІСЦІНЫ І ФІНІШ ВЯЛІКАЙ РАБОТЫ»

часовай аплаты. «Такіх фактаў няма. Ідзе планавая прыёмка і разлікі за пастаўленае зерне», — адказаў старшыня Брэсцкага аблвыканкама.

Глабальных праблем няма і ў Гродзенскай вобласці. Як далажыў старшыня аблвыканкама Уладзімір Каранік, тэхніка адрамантавана, кадры ёсць, крыніцы фінансавання вызначаны. У Гродзенскай вобласці толькі 28 працэнтаў ад нормы ападкаў выпала ў маі-чэрвені. Але пацярпеў гэты рэгіён менш, чым іншыя вобласці. Ніякіх праблем па забеспячэнні жывёлагадоўлі і насельніцтва збожжам мы не бачым», — адзначыў Уладзімір Каранік. Праўда, сітуацыя з нарыхтоўкай кармоў складаная: першы ўкос аказаўся горшы за леташні, таму ёсць некаторае адставанне ад графіка.

Складанай, але не катастрафічнай сітуацыю ў Мінскай вобласці назваў яе кіраўнік Аляксандр Турчын. «У нас сёння праблем, якія былі б звязаныя не з асаблівымі прыродна-кліматычнымі ўмовамі, няма. Дажджы пайшлі, і мы сёння бачым, як прагрэсіруе наша кукуруза», — адзначыў ён.

Як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, сітуацыя з надвор'ем ва ўсіх рэгіёнах розная, недзе землі пацярпелі больш, недзе — менш. «Я выдатна разумею, гэта не леташняя ўмовы. Калі 40 дзён у краіне не было дажджоў, то, натуральна, на ўсіх раёнах гэта неяк адбілася. Але спасылацца на тое, што вось бяда, згарэла ўсё, — гэта няправільна. Захаваем збожжа, якое сёння ёсць у полі, — значыць, будзем мець ураджай», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Працягваючы гаворку пра Міншчыну, Аляксандр Лукашэнка спытаў, як выконваецца яго даручэнне па будаўніцтве малочнатаварных комплексаў у рэгіёне. Да канца года тут плануецца ўзвесці 20 аб'ектаў. За гэта адказвае кіраўніцтва не толькі вобласці, але і самой сталіцы. Агульны кошт укладанняў Мінскага гарвыканкама складае Br100 млн. Прэзідэнт нагадаў, што ўжо ставіў задачу зрабіць так, каб у будучай пяцігодцы ўвесь дойны статак перавесці ў тэхналагічныя малочна-таварныя комплексы.

Старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў далажыў, што першы малочнатаварны комплекс літаральна днямі ўведзены ў эксплуатацыю. Гатоўнасць астатніх аб'ектаў — ад 70 працэнтаў. Плануецца, што яны запрацуюць да канца года.

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка далажыў, што ва ўсіх раёнах вобласці пачалі ўборку збожжавых культур і азімага рапсу. Адначасова пачата рэалізацыя збожжа ў лік рэспубліканскіх дзяржпатрэб. Па словах кіраўніка рэгіёна, работа ідзе без асаблівых праблем у планавым рэжыме. Але ёсць пытанне, якое датычыцца паліва. «У нас не пралічваецца ў поўным аб'ёме паліва да 1 верасня. З улікам уборкі і кукурузы. Таму я прасіў бы сёння сумесна з урадам разгледзець дадзенае пытанне. Адно пытанне, якое ёсць, праблемнае. Астатнія пытанні мы вырашаем і вырашым», — заявіў губернатар. Ён растлумачыў недахоп паліва ўмовамі надвор'я, з-за якіх на палях спатрэбілася выканаць дадатковыя аб'ёмы работ.

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін расказаў, што актыўная фаза ўборкі ў рэгіёне пачнецца праз 7-10 дзён. Вобласць да яе поўнасцю гатовая, як запэўніў губернатар. «Пачалі акуратна, дзе палі падышлі, убіраць рапс, азімыя. Ураджайнасць недзе 16,4 ц/га. Гэта прыблізна на ўзроўні мінулага года», — адзначыў ён.

Аляксандр Субоцін далажыў, як у вобласці рэалізоўваецца даручэнне «дастаць усё ламачча з-пад плота». Па яго словах, работа ідзе інтэнсіўна. Сёлета з гэтага ламачча было сабрана і будзе працаваць 38 камбайнаў і 102 трактары рознай магутнасці. Што да нарыхтоўкі травяністых кармоў, то, нягледзячы на павялічаныя плошчы ўборкі, ураджайнасць сёлета, на жаль, ніжэйшая. Тым не менш, у кожным раёне і гаспадарцы ёсць праграмы, як недастатковую частку кармоў будуць дадаваць. «Дарожная карта напісана на кожны выпадак», — запэўніў губернатар.

Аляксандр Лукашэнка пахваліў губернатара за тое, наколькі глыбока ён унік у пытанні сельскай гаспадаркі пасля работы на іншых высокіх пасадах. Але адначасова Прэзідэнт паставіў і жорсткую задачу: «Майце на ўвазе, што ні ў Ісачанкі, ні ў Крупко, ні ў вас адступаць няма куды. Усё! Адступаць няма куды! Усходняя вобласці павінны даваць прагрэс. Яны павінны развівацца і даваць нармальную дынаміку».

Ва ўсіх раёнах Гомельскай вобласці ўжо кіпіць уборачная кампанія. На пятніцу, як далажыў губернатар Іван Крупко, было ўбрана 16 працэнтаў збожжавых культур. Канчаецца ўборка рапсу. Па ўраджайнасці чакаецца ўзровень мінулага года. Гатоўнасць тэхнікі ў рэгіёне дае магчымасць убіраць да пяці працэнтаў плошчаў у дзень, ёсць дастатковыя магутнасці сушыльнай гаспадаркі. Губернатар канстатаваў, што ўмовы надвор'я ўдарылі па каласавых, але ў вобласці своечасова сарыентаваліся. Плануюць кампенсаваць недабор за кошт кукурузы. Выдзелены фінансавыя рэсурсы на дадатковую куплю збожжа, ёсць забяспечанасць кадрамі. Нядрэнныя разлікі ёсць на нарыхтоўку травяністых кармоў, хоць у першым укосе крыху недабралі.

Іван Крупко, як і яго калегі, звярнуў увагу на пытанне з палівам. На ліпень, жнівень і частку верасня ў рэгіёна хопіць запасаў. А далей, з улікам вялікага аб'ёму работы, спатрэбяцца адтэрмінаваныя крэдыты.

«Гомельскую вобласць трэба выцягваць з балота. Гэта надобра. Прыгожая вобласць, прыгожыя людзі, а мы там боўтаемся. Таму прымайце самыя рашучыя меры», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

## «АДПРАЎЛЯЮ, КАБ ПАДНЯЦЬ ВІЦЕБСКУЮ ВОБЛАСЦЬ»

Аб тым, як вырашаюцца самыя праблемныя моманты аграпрамысловага комплексу, далажыў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар Брыло. Так, ва ўборачнай кампаніі будзе задзейнічана 7,5 тысячы камбайнаў. Гатоўнасць тэхнікі складае 99 працэнтаў, праўда, гэты паказчык адрозніваецца па рэгіёнах. Напрыклад, у Віцебскай вобласці — 98 працэнтаў. Міністр падкрэсліў, што па забяспечанасці гаспадарак тэхнікай у параўнанні з мінулым годам ёсць станоўчая дынаміка і штогод сітуацыя паляпшаецца. «Летась купілі 405 камбайнаў, сёлета плануем узяць за год 800», — праінфармаваў ён.

Акрамя паставак новай тэхнікі, па даручэнні Прэзідэнта значна актывізаваны працэс рамонту і аднаўлення старой. Пры садзейнічанні Міністэрства прамысловасці былі адрамантаваны і адноўлены 215 збожжаўборачных камбайнаў, 188 — кормаўборачных, больш як 800 трактароў. Ігар Брыло запэўніў, што аграрыі прыкладуць усе намаганні, каб нарыхтаваць патрэбныя аб'ёмы кармоў. Тым больш умовы надвор'я даюць падставы спадзявацца на нядрэнны другі ўкос травяністых кармоў. Што да пытання нарыхтоўкі збожжавых сёлета, міністр адзначыў, што прагназуемы недабор — у раёне мільёна тон. Але для краіны гэта не крытычна, паколькі, паводле яго слоў, «на складах ёсць каля мільёна тон пераходнага астатку». Ігар Брыло таксама згадаў станоўчыя тэндэнцыі ў вырашэнні праблем з падзяжом жывёлы. Паводле яго даных, узровень непрадукцыйнага выбыцця сёлета скараціўся на 21 тыс. у параўнанні з паказчыкамі за аналагічны леташні перыяд.

«Мы ў гэту ўборачную кампанію падрыхтаваліся не горш, а, думаю, па некаторых кампанентах нават лепш, чым летась», — падсумаваў Ігар Брыло.



З селектарнай нарады Ігар Брыло выйшаў памочнікам Прэзідэнта па Віцебскай вобласці. Пра іх пераход на новую пасаду Аляксандр Лукашэнка аб'явіў падчас абмеркавання сітуацыі з уборачнай кампаніяй на Віцебшчыне. Прэзідэнт падкрэсліў, што асабіста міністр сельскай гаспадаркі нясе за тое адказнасць як адказны за вобласць. «Значыць, з гэтай вось уборачнай кампаніі міністра сельскай гаспадаркі — памочнікам у Віцебскую вобласць. І мне дакладваць штотыдзень аб сітуацыі. Падобна, там забыліся, што трэба працаваць. І ўсе чакаюць. Нейкая надзея ў іх, што прыйдзе нехта, грошы прынясе. Павінна быць рэалізавана. Разам з Субоціным за гэта галавой адказваеш», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Прэм'ер-міністру Раману Галоўчанку даручана аператыўна падабраць кандыдатуру новага міністра сельскай гаспадаркі і харчавання.

Прэзідэнт звярнуўся і да губернатара Віцебскай вобласці Аляксандра Субоціна: «Хацелася б, каб вы прынялі новага памочніка. Але спакойнага жыцця вам не будзе. Вы ж разумееце, што я не ў ссылку адпраўляю Брыло. А для таго, каб усё ж мы Віцебскую вобласць паставілі на ногі. Але ведаем, што рабіць. Прамая сувязь у яго будзе з усімі тымі, з кім ён сёння працуе на аднолькавых правах — міністры, члены ўрада».

## ДЫСЦЫПЛІНА, ТЭХНАЛОГІІ І РЭЗЕРВЫ

Падводзячы вынікі селектарнай нарады, Аляксандр Лукашэнка даў шэраг даручэнняў па самых важных пытаннях. Што датычыцца закупкі паліва, то кіраўнік дзяржавы даручыў ураду ў найбліжэйшы час сабраць старшынь аблвыканкамаў і разам з імі вырашыць праблемныя пытанні. Дзе трэба — падставіць плячо. Дзе не хочуць працаваць — унесці прапановы.

Асаблівую ўвагу Аляксандр Лукашэнка ўдзяліў выбару асноўных сельскагаспадарчых культур, на якія трэба рабіць упор, — азімы ячмень, кукуруза і рапс. Гаворачы пра перавагі азімага ячменю, ён падкрэсліў, што ніхто не настойвае на штучным насаджэнні гэтай культуры па ўсёй краіне, таму не трэба праводзіць паралелі з распаўсюджваннем кукурузы пры Мікіту Хрушчове. «Падкрэсліваю: азімы ячмень — гэта не мая выдумка, мы яго апрацоўвалі даўно, але па рэшткавым прынцыпе. Мы ніколі не аддавалі гэтай культуры асаблівай увагі, а ёй трэба ўдзяляць асаблівую ўвагу, калі вырашылі яе апрацоўваць», — заявіў беларускі лідар. Ён падкрэсліў, што гэта капрызная культура, але яна добрая там, дзе выконваюцца тэхналогіі. Зрэшты, як і іншыя культуры. «Азімаму ячменю, я лічу, быць. Ён перажыў катастрофы мінулага і гэтага гадоў і даў нядрэнны ўраджай». На асобных палях у Беларусі яго ўраджайнасць дасягае 70-100 ц/га», — сказаў Прэзідэнт. Вялікай перавагай дадзенай культуры з'яўляецца ранні тэрмін яе ўборкі — да пачатку масавай уборачнай кампаніі, што дае магчымасць загадзя абкатаць тэхніку, падрыхтаваць механізатараў і іншы персанал.



Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка пазітыўна ацаніў перспектывы вырошчвання рапсу. Ён назваў яго добрай грашовай культурай, якой трэба займацца, зразумела, выконваючы ўсе тэхналогіі. «Нават пры ўраджайнасці 35 ц/га азімы рапс дае вельмі добры даход. Кітайцы просяць павялічыць пастаўкі ім рапсавага алею. Ды і еўрапейцы, якімі б санкцыі ні былі, з задавальненнем будуць браць у вас той алей. І трэба паціху наша насельніцтва прывучаць да рапсавага алею. Ён не горшы, чым сланечнікавы, а па многіх паказчыках — нават лепшы», — сказаў Прэзідэнт.

Але, звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, мэтазгоднасць вырошчвання гэтых культур павінна ацэньвацца на месцах. Цісніце і настойвайце не трэба. І, зрабіў акцэнт Аляксандр Лукашэнка, — тэхналогіі і яшчэ раз тэхналогіі.

Прэзідэнт засяродзіў увагу на выкананні рацыянальных падыходаў да падрыхтоўкі глебы пад будучыя пасевы. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, трэба рацыянальна паставіцца да пасеваў кукурузы, вызначыўшыся са стратэгіяй: што рыхтаваць на сілас, а што пакідаць на зерне. Прэзідэнт закрануў пытанне закупкі насення, якое не вырабляецца ў нашай краіне, напрыклад люцэрны. На яго думку, мэтазгодна арганізаваць агульны закуп для патрэб усіх сельгасарганізацый, што дасць магчымасць за кошт значных аб'ёмаў набыць насенне па больш выгаднай цане. Адно з даручэнняў Прэзідэнта датычылася дадатковага забеспячэння сельгасарганізацый механізатарамі на час уборачнай кампаніі.

«Упаўнаважаным і памочнікам — неадкладна выехаць на месцы і аказаць усякую падтрымку губернатарам і абласцям у арганізацыі ўборачнай кампаніі», — агучыў яшчэ адно даручэнне Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт расказаў, што да яго паступаюць скаргі на нясвоечасовыя разлікі перапрацоўчых прадпрыемстваў за прадукцыю. У прыватнасці, гаворка ішла пра малако і мяса. Па яго словах, гэта недапушчальна. Ён даручыў Раману Галоўчанку вырашыць дадзеную праблему, каб не было ніякай запазычанасці.

«Я бачу, што праведзена вельмі вялікая работа па падрыхтоўцы ўраджаю. Людзі разумеюць, што нам трэба сёння мабілізавацца, ад гэтага залежыць наша будучыня», — рэзюмаваў Прэзідэнт. Па яго словах, верагоднасць недабору па асобных культурах запланаванага аб'ёму ўраджаю не выклікае моцнай занепакоенасці. У больш ураджайныя гады ў краіне быў сфарміраваны дастатковы запас, у тым ліку па збожжы. «У нас у рэзерве мільён тон збожжа — тое, чаго я ад вас заўсёды патрабаваў: няхай будзе рэзерв. Сёння няма праблем, гэты недабор мы спакойна перакрываем са сваіх рэзерваў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў дадзеным пытанні варта падыходзіць да справы па-вясковаму. «Запас бяды не чыніць. Трэба абавязкова мець рэзервы, запасы. Чаго б нам ні каштавала, трэба глядзець не толькі па баках, але і ўнутр на нашы рэзервы, якія мы можам выкарыстоўваць», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Стала вядома

# МІНІНФАРМ АБ'ЯВІЎ КОНКУРС НА НАЙЛЕПШЫ ЖУРНАЛІСЦКІ МАТЭРЫЯЛ ПРА ЖНІВО-2023

**Міністэрства інфармацыі сумесна з Беларускім прафесійным саюзам работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму аб'явіла старт рэспубліканскага творчага конкурсу сярод журналістаў СМІ на тэму ўборачнай кампаніі 2023 года «Хвала рукам, што пахнуць хлебам». Аб гэтым паведамілі ў Мінінфарме.**

Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца журналісты і творчыя работнікі друкаваных і тэлерадыёвяшчальных СМІ, інфармацыйных агенцтваў, сеткавых выданняў, якія ўваходзяць у рады галіновага прафсаюза, па прадстаўленні рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, інфармацыйнага агенцтва, у адпаведнасці з намінацыямі конкурсу.

На конкурс прадстаўляюцца матэрыялы, якія апублікаваны ў друку або выйшлі ў эфір тэлевізійных або радыёвяшчальных СМІ, размешчаны на інтэрнэт-сайтах у перыяд уборачнай кампаніі 2023 года. Яго асноўныя мэты — рэалізацыя задач дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі ў развіцці аграрнага комплексу і забеспячэнні харчовай бяспекі краіны, фарміраванне павагі да чалавека працы, паказ яркіх дасягненняў падчас уборачнай кампаніі, садзейнічанне выхаванню працавітасці ў моладзі на прыкладзе найлепшых экіпажаў камбайнераў, працоўных калектываў.

Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях: «Найлепшы аўтарскі матэрыял (нарыс, рэпартаж, спецыяльны праект) у рэспубліканскіх друкаваных СМІ і сеткавых выданнях», «Найлепшы аўтарскі матэрыял (нарыс, рэпартаж, спецыяльны праект) у рэгіянальных друкаваных СМІ і сеткавых выданнях», «Найлепшы аўтарскі матэрыял (відэасюжэт, рэпартаж, спецыяльны праект), які выйшаў у эфір рэспубліканскіх тэлевізійных або радыёвяшчальных СМІ», «Найлепшы аўтарскі матэрыял (відэасюжэт, рэпартаж, спецыяльны праект), які выйшаў у эфір рэгіянальных тэлевізійных або радыёвяшчальных СМІ», «Найлепшы фотаматэрыял у рэспубліканскіх друкаваных і сеткавых СМІ», «Найлепшы фотаматэрыял у рэгіянальных друкаваных і сеткавых СМІ».

У кожнай намінацыі вызначаецца адзін пераможца, які будзе адзначаны дыпломам конкурсу і грашовай прэміяй у памеры 20 базавых велічынь.

Заяўкі прымаюцца да 25 жніўня (уключна) на адрас: 220004, г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 11, кабінет 402 з пазнакай: «На конкурс «Хвала рукам, што пахнуць хлебам». Кантактны тэлефон: 8 (017) 203-26-84, e-mail: ups@mininform.gov.by.

# «Беларуснафта» плануе развіваць сетку электразаправачных комплексаў

**Аб гэтым у прэс-цэнтры БелТА расказаў начальнік упраўлення нафтапрадуктазабеспячэння цэнтральнага апарату РУП «Вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта» Юрый АНАНЧАНКА.**

«Кампанія «Беларуснафта» інтэнсіўна ўдзельнічае ў працэсе аснашчэння аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу. Цяпер мы ўжо не так актыўна будуем запраўкі, як гэта было ў папярэднія гады. У асноўным займаемся рэканструкцыяй старых аб'ектаў размяшчэння, грамадскага харчавання і гандлёвых плошчаў. Летась у нас было рэканструявана 11 аб'ектаў, сёлета плануем 17. На дадзены момант мы займаем 70 працэнтаў рынку ў Беларусі», — заявіў Юрый Ананчанка. Паводле яго слоў, стандарты кіравання і абслугоўвання, а таксама патрабаванні для ўсіх аб'ектаў «Беларуснафты» аднолькавыя.

Акрамя таго кампанія мадэрнізуе ўсе свае аб'екты. Напрыклад, павялічваецца колькасць спавівальных столікаў, уладкоўваюцца месцы адпачынку для дзяцей, дзе ў іх будзе магчымасць гуляць і маляваць.

«Таксама «Беларуснафта» аддае дастаткова вялікую ўвагу структуры і развіццю сеткі электразаправачных комплексаў. Цяпер ідзе змяненне рынку, электратранспарту становіцца ўсё больш, і ў сувязі з гэтым на нашых заправачных станцыях шукаюцца магчымасці для таго, каб устанаўліваць хуткія зарадныя комплексы і мінімізаваць час для запраўкі электрамабіляў. Акрамя таго, у нас ёсць яшчэ прыпынкі для караванаў, якія мы падтрымліваем у неабходным стане. На дадзены момант мы ўжо пачынаем фарміраваць бюджэт на 2024 год, будзем працягваць развіваць сеткі АЗС надалей», — адзначыў начальнік упраўлення нафтапрадуктазабеспячэння цэнтральнага апарату РУП «Вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта».

Добрая навіна

# НОВАЯ ШКОЛА АДКРЫЕЦЦА 1 ВЕРАСНЯ Ў СЕНІЦЫ ПАД МІНСКАМ

**Новая школа на 720 месцаў адкрыецца 1 верасня ў аграгарадку Сеніца Мінскага раёна, паведаміла журналістам у прэс-цэнтры БелТА першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама Софія ФІЛІСТОВІЧ.**

«На падрыхтоўку ўстаноў да новага навучальнага года ў вобласці запланавана накіраваць больш як Br55 млн, у тым ліку на правядзенне бягучых і капітальных рамонтаў. Выдзелены Мінскім абласным выканаўчым камітэтам сродкі на набыццё 118 камп'ютарных класаў», — расказала Софія Філістовіч.

У будынках абнаўляюцца фасады, дахі, мяняюцца аконныя блокі, добраўпарадкоўваюцца прышкольныя тэрыторыі. Капітальны рамонт праводзіцца ў 31 установе адукацыі.

Софія Філістовіч таксама паведаміла, што ў рэгіёне праведзена аптымізацыя сеткі ўстаноў. Закрыты або рэарганізаваны школы з невысокай напаўняльнасцю ў сельскай мясцовасці. Усім педагогам прапанавана новае месца работы, будзе арганізаваны падвоз навучэнцаў.

«Усе ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі вызначыліся з другім элементам школьнай формы. Працуюць школьныя кірмашы», — адзначыла Софія Філістовіч.

Усяго ў Мінскай вобласці налічваецца больш за 500 школ. Як чакаецца, у першыя класы прыйдзе каля 18 тысяч дзяцей, у 10-я класы — каля васьмі тысяч навучэнцаў. Адкрываюцца прафільныя класы — педагагічныя, аграрныя, спартыўна-педагагічныя і іншыя.

Усе дзеці будуць забяспечаны месцамі ў школах, але не заўсёды ў крокавай даступнасці, адзначыла першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама. «Асабліва гэта датычыцца Мінскага раёна — Новай Баравой і Калодзішчаў. Тут у нас вельмі цесна арганізавана ўзаемадзеянне з камітэтам па адукацыі Мінгарвыканкама», — падкрэсліла Софія Філістовіч. Паводле яе слоў, дзеці, якія не маюць магчымасці трапіць у школу непасрэдна ў Мінскім раёне, забяспечваюцца месцамі ў сталіцы.

Таксама да канца года на Міншчыне чакаецца ўвод чатырох новых дзіцячых садкоў — у Мінскім, Смалявіцкім і Лагойскім раёнах.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Інфляцыя ў Японіі павялічылася да 3,3 працэнта



Спажывецкія цэны ў Японіі ў чэрвені ўзраслі на 3,3 працэнта ў гадавым выражэнні. Такія даныя прыводзяцца ў справаздачы міністэрства ўнутраных спраў і камунікацый краіны. Такім чынам, інфляцыя паскорылася ў параўнанні з папярэднім месяцам. Кошт прадуктаў харчавання ў Японіі ў чэрвені ўзрос на 8,4 працэнта, жыллё падаражэла на 1,1 працэнта, транспартныя паслугі — на 2,2 працэнта, мэбля і тавары для дому — на 8,6 працэнта, адзенне — на 3,9 працэнта. Спажывецкія цэны ў чэрвені павялічыліся на 0,2 працэнта ў параўнанні з папярэднім месяцам.

### У Пакістане з-за мусонных дажджоў і паводак загінула больш за сто чалавек



У выніку паводак, выкліканых мусоннымі дажджамі, у Пакістане загінула больш за сто чалавек і яшчэ 180 пацярпелі. Пра гэта паведаміла Пакістанскае Нацыянальнае ўпраўленне па барацьбе са стыхійнымі бедствамі. Паводле яго звестак, мацней за ўсё ад лівяў пацярпела правінцыя Усходні Пенджаб — там загінулі 57 чалавек і 118 атрымалі раненні. Звыш паўсотні дамоў было разбурана. Ад удару стыхіі сур'ёзна пацярпелі сталіца правінцыі Лахор і горад Равалпіндзі, дзе за апошнія некалькі сутак выпала рэкордная колькасць ападкаў. Тут з-за паводкі абрынуўся мост, што прывяло да гібелі 12 рабочых. Паводкавыя воды затапілі многія жылыя раёны, паралізавалі работу транспарту і выклікалі перабоі ў электразабеспячэнні. Не менш як 25 чалавек загінула і яшчэ 41 атрымалі раненні ў выніку асобных аварый, звязаных з дажджамі, у правінцыі Хайбер-Пахтунхва на паўночным захадзе краіны. У правінцыі Паўднёвы Сінд дзесяць чалавек загінулі і яшчэ двое атрымалі раненні ў выніку ўдару маланкі ў дом. Таксама ёсць інфармацыя аб загінулых у сельскіх раёнах заходняй правінцыі Белуджыстан і ў паўночным рэгіёне Гілгіт-Балтыстан, дзе мусонныя дажджы не спыняюцца з 25 чэрвеня.

### Французская армія адчувае дэфіцыт кадраў з-за нізкіх заробкаў



Армія Францыі сутыкаецца з дэфіцытам маладых кадраў з-за недастатковай прывабнасці службы, складаных умоў і нізкіх заробкаў. Пра гэта са спасылкай на радыёстанцыю Europe 1 паведаміла РІА «Навіны». Кіраўніцтва французскай арміі непакоіць існуючая сітуацыя. Сёлета ваенныя не змогуць набраць неабходную колькасць навабранцаў. Пры гэтым радыёстанцыя не ўдакладняе, колькі планавалася набраць маладых людзей. Кадравыя цяжкасці таксама тлумачаца тым, што арміі не ўдаецца ўтрымаць радавых і ўнтэр-афіцэраў у сваіх шэрагах, многія з іх у канчатковым выніку вырашаюць перайсці ў прыватны сектар, паведаміла Europe 1.


Слодыч

# ФАБРЫКА «СЛОДЫЧ» ПАКАРАЕ НОВЫЯ ВЯРШЫНІ

**За апошнія два гады ААТ «Кандытарская фабрыка «Слодыч» змагла значна пашырыць асартымент прадукцыі і павялічыць аб'ём вытворчасці ў 2022 годзе на 27,4 %. Сёння «Слодыч» — гэта не толькі печыва, прадпрыемства выпускае цукеркі, вафлі, пернікі, зефір.**




Аб'ём рэалізаванай прадукцыі на экспарт за апошні год вырас на 23,2 %, а выручка ад рэалізацыі павялічылася на 25 %, што з'яўляецца пацвярджэннем якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі «Слодыч».

Геаграфія паставак — больш як 20 краін. За 2022 год рынак Расійскай Федэрацыі мае найбольшую долю ў экспарце, потым – Манголія і Арменія.

У 2023 годзе фабрыка «Слодыч» рэалізавала сумесны буйны праект, заключыўшы супрацоўніцтва з расійскім кандытарскім прадпрыемствам «Любімы край» для запуску лінейкі дзіцячага печыва, прызначанага для малых узростам ад 6 месяцаў, пад расійскай гандлёвай маркай. Гэтае супрацоўніцтва з'яўляецца важнай падзеяй не толькі для абедзвюх кампаній, але і для спажыўцоў, якія заўсёды шукаюць якасныя і бяспечныя прадукты для сваіх дзяцей.

Галоўнай прычынай выбару ў якасці партнёра фабрыкі «Слодыч» — дастойная якасць прадукцыі.

Аднак гэта толькі пачатак, і абедзве кампаніі плануюць пашырыць асартымент.

Дзякуем усім нашым пакупнікам за падтрымку і давер да нашай прадукцыі. Мы гатовыя пакараць новыя вяршыні і дасягаць яшчэ большых вынікаў.

УНП 100129695

Лічбавы беларус

# РЭІНЖЫНІРЫНГ АДМІНПРАЦЭДУР

## «Электронныя» навелы Дырэктывы № 2

**Замацаваецца на абслугоўванне ў паліклініцы, атрымаць пасведчанне кіроўцы, стаць на ўлік у дзіцячы садок, заказаць даведку аб налічэнні пенсіі... Кожная з гэтых неабходнасцяў — асобная адміністрацыйная працэдура (АП), якіх у Беларусі амаль тысяча, і ўсе яны створаны для ўзаемадзеяння фізічных і юрыдычных асоб з дзяржавай. Каб не стукаць штораз у розныя дзверы, вельмі зручна заказваць такія паслугі ў «лічбе». На гэта скіравана і Дырэктыва № 2 «Аб дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату і павышэнні якасці забеспячэння жыццядзейнасці насельніцтва», якая нядаўна была выкладзена ў новай рэдакцыі. Яе галоўная ідэя — глабальная лічбавізацыя ўсіх галін жыцця і іх электроннае ўзаемадзеянне паміж сабой і з насельніцтвам. Пра асноўныя навелы Дырэктывы распавялі ў Нацыянальным цэнтры электронных паслуг (НЦЭП).**



### Аптымізаваць і алічбаваць

Найгалоўнейшая ўвага аддаецца дзяржавай **удасканаленню лічбавых магчымасцяў службы «Адно акно»,** якая заклікана павысіць якасць атрымання насельніцтвам паслуг праз павялічаны тэрмін работы (да васьмі гадзін вечара) і прапаноўвае людзям альтэрнатыўныя шляхі для заказу патрэбных ім адміністрацыйных працэдур і паслуг (падаваць запыт у электронным выглядзе і атрымліваць адказ гэткім жа чынам), расказала **Святлана КАРАНЕВІЧ, начальнік аддзела электроннай камерцыі НЦЭП:**

— Каб пэўная АП была пераведзена ў электронны выгляд, патрэбна карпатлівая работа з дзяржорганамі, якія за яе адказваюць. Працэдуру нельга проста алічбаваць — яна павінна прайсці рэінжынірынг, аптымізавацца і палепшыцца. Неабходна замяніць электроннымі дакументамі частку лішніх звестак, якія трэба збіраць у папяровым выглядзе для атрымання паслугі, а таксама падумаць, за кошт чаго можна скараціць тэрмін здзяйснення адмінпрацэдуры. А алічбоўваць — ужо гэтую ўдасканаленую працэдуру.

У самой Дырэктыве сказана, што «кіраўнікам дзяржорганаў трэба **сканцэнтраваць намаганні на пераводзе адмінпрацэдур, найперш запатрабаваных насельніцтвам, у электронную форму».** Каб выканаць такую задачу, дзейнічае пастанова прэм'ер-міністра № 119р, дзе вызначаны канкрэтныя спісы АП пэўных дзяржорганаў, якія неабходна перавесці ў электронны выгляд (з указаннем тэрмінаў і адказных выканаўцаў).

Гаворачы пра службу «Адно акно», нельга забывацца на праграмны комплекс (ПК) «Адно акно» (на пляцоўцы адзінага партала), паколькі адмінпрацэдуры могуць кансалідавацца ў абодвух гэтых месцах, нагадала Святлана Караневіч:

— Калі мы кажам пра грамадзян, гэта найчасцей тыя АП, якія ажыццяўляюць мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы — тыя самыя службы «Адно акно». Праз ПК «Адно акно» цяпер можна атрымаць 212 адмінпрацэдур, хоць іх існуе значна больш. Справа ў тым, што кожны ўпаўнаважаны орган, які адказвае за пэўную адмінпрацэдуру, сам вырашае, ці будзе яна аказвацца праз ПК «Адно акно». Спецыялісты Цэнтра заахвочваюць дзяржорганы (калі гэта мясцовыя выканкамы), каб усё больш працэдур кансалідавалася ў службе «Адно акно» і каб іх у тым ліку можна было атрымліваць праз ПК «Адно акно».

### Ідэнтыфікацыйныя даныя юрыдычнай сілы электроннай даведкі

Усе цяперашнія працэдуры ПК «Адно акно» алічбаваны пакуль часткова, то-бок іх электроннае аказанне пачынаецца толькі пасля таго, як чалавек фізічна сходзіў у службу «Адно акно» і падаў пакет дакументаў. Цяпер для кожнай з існуючых 212 працэдур трэба дапрацаваць магчымасць рэалізоўваць падачу заявы непасрэдна з адзінага партала.



— Ужо праходзіць пілотны праект з Мінгарвыканкамам, у межах якога і робіцца такая дапрацоўка для 13 найбольш запатрабаваных па сталіцы адмінпрацэдур, каб можна было падаць заяву на іх ажыццяўленне проста «з канапы» і не хадзіць да апарата службы «адно акно», — паведаміла начальнік аддзела. — Такім чынам будуць дароблены «хвосцікі» гэтых адмінпрацэдур, каб яны сталі цалкам лічбавымі: ад падачы заявы да атрымання выніковага рашэння (непасрэдна даведкі) у асабісты электронны кабінет. Пасля дадзена практыка распаўсюдзіцца і на астатнія АП з 212 існуючых.

Дырэктывай прадпісана, што «электронныя дакументы, а таксама дакументы ў электронным выглядзе: **паведамленні і іншыя звесткі, накіраваныя дзяржорганамі ў асабістыя электронныя кабінеты на адзіным партале, з'яўляюцца сапраўднымі, атрыманымі і валодаюць юрыдычна значнымі наступствамі, то-бок прыраўноўваюцца да дакумента з подпісам і пячаткай».**

— Цэнтр сёння працуе над тым, каб стварыць сэрвіс праверкі такіх дакументаў, кожны з якіх будзе ідэнтыфікавацца пэўнымі данымі, хутчэй за ўсё, нумарам і QR-кодам. Мяркуецца, што такую магчымасць рэалізуюць да канца ліпеня, — удакладніла Святлана Караневіч. — Дзякуючы гэтаму грамадзянін зможа з дакументам (або без яго, а толькі з ідэнтыфікацыйнымі данымі дакумента) прыйсці ў дзяржорган, якому патрэбна даведка, што прыйшла ў кабінет грамадзяніна, а спецыяліст дзяржоргана, у сваю чаргу, праз адзіны партал убачыць па гэтых даных той самы электронны дакумент. І гэтага будзе дастаткова, каб давяраць сапраўднасці дакумента. Яшчэ лепшы ідэальны варыянт, калі чалавек зможа праз электронную пошту пераслаць даведку, накіраваную ў яго асабісты кабінет, у той дзяржорган, якому яна неабходная, а не прыходзіць туды. Гэта зручна, паколькі даведкі, якія заказвае чалавек, як правіла, патрэбныя яму менавіта для прад'яўлення пэўнаму дзяржоргану. Мусіць, неабходна на нарматыўным узроўні замацаваць механізм, каб упаўнаважаныя органы праводзілі такія мерапрыемствы па зверцы дакументаў.

### Не проста падключацца, а выкарыстоўваць

Яшчэ адна задача абноўленай Дырэктывы — **максімальнае выкарыстанне дзяржорганамі электроннага дакументаабароту.** Да сістэмы міжведамаснага дакументаабароту (СМДА) падключылася ўжо сто працэнтаў дзяржорганаў і арганізацый, а таксама недзяржаўныя кампаніі, якія пажадалі далучыцца да магчымасці абменьвацца карэспандэнцыяй у згаданай сістэме, дадала прадстаўніца НЦЭП:

— Аднак застаецца шэраг дзяржарганізацый больш нізкага ўзроўню (напрыклад, тыя, што падпарадкоўваюцца аблвыканкамам) або дзіцячыя садкі ці лагеры, якія працуюць толькі ў сезон. Многія з іх падключаныя да СМДА чыста намінальна, а непасрэдна сэрвісам дакументаабароту не карыстаюцца. Каб выканаць распараджэнне Дырэктывы, ім цяпер прыйдзецца выкарыстоўваць электронны дакументаабарот пры рэалізацыі дзяржфункцый у рамках узаемадзеяння паміж сабой або ажыццяўлення адмінпрацэдур.

Станоўчы момант выкарыстання СМДА на практыцы ў наступным. ПК «Адно акно» інтэграваны з рознымі інфармацыйнымі рэсурсамі і дазваляе атрымаць з іх даныя, якіх не хапае. А калі такіх рэсурсаў няма, то даныя, якіх не хапае, можна атрымаць па СМДА ад нейкай арганізацыі. Такім чынам, чым больш арганізацый падключана да СМДА і выкарыстоўвае электронны дакументаабарот, тым большай колькасці арганізацый можна будзе накіраваць такія электронныя запыты, растлумачыла Святлана Караневіч:

— Цяпер праз ПК «Адно акно» можна рабіць запыты ў восем дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў (ДІР). А, згодна з указаннем Дырэктывы, **на працягу шасці месяцаў трэба вызначыць пералік такіх ДІР, якія неабходна інтэграваць з агульнадзяржаўнай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмай (ААІС) для ажыццяўлення адмінпрацэдур.** Калі такія рэсурсы абазначаць і інтэгруюць, аператары службы «Адно акно» змогуць рабіць больш электронных запытаў і больш адмінпрацэдур будзе алічбавана ў прынцыпе.

У дадзены момант Саўмін і агенцтва па сэрвісізацыі вызначаюць, якія ДІР, неабходныя для ажыццяўлення адмінпрацэдур, павінны з'явіцца ў ААІС, і аналізуюць, якія звесткі па працэдурах, што заяўнік пакуль прыносіць асабіста, можна замяніць інфармацыяй з ДІР.

Дакумент таксама прадпісвае **да 1 верасня прыняць меры па ўдасканаленні парадку выкарыстання ПК «Адно акно».** Нярэдка здараецца, што арганізацыі ці службы «Адно акно» падключаюць ПК «Адно акно» толькі для аднаго працоўнага месца, а астатнія працуюць па-ранейшаму, без падключэння да сістэмы. Пры наяўнасці ПК «Адно акно» на кожным працоўным месцы ў ведамстве можна ўсе дакументы перадаваць у электронным выглядзе.

### Праверка аўто, работы, здароўя...

**Сёння ў асабістым электронным кабінеце беларуса на адзіным партале электронных паслуг даступна 112 электронных адмінпрацэдур і 195 паслуг, а праз два гады іх колькасць павялічыцца больш як удвая.** За апошні год (з другой паловы 2022-га) распрацавана больш за 30 % новых электронных паслуг ад агульнай колькасці створаных за папярэднія дзесяць гадоў.

З пачатку года ў Беларусі з'явілася, напрыклад, 12 паслуг, якія створаны на падставе звестак АІС ДАІ. Яны, у прыватнасці, дазваляюць пацвердзіць факт выдачы пасведчання кіроўцы або праверыць наяўнасць звестак аб абмежаванні ў праве кіравання.

— Не ўсе з гэтых 12 паслуг даступныя шырокаму колу карыстальнікаў. Большасць прызначана для дзяржорганаў для выканання імі службовых функцый і вельмі карысная для каршэрынгавых кампаній і арганізацый, якія займаюцца груза- і пасажырскімі перавозкамі. Яны дазваляюць імгненна праверыць даныя і ўбачыць наяўнасць абмежаванняў, што, безумоўна, садзейнічае лепшаму кантролю і павышэнню бяспекі дарожнага руху, — падкрэсліла эксперт. — Можна таксама ўбачыць, ці не ўдзельнічала машына ў ДТЗ, і праверыць, ці не знаходзіцца аўто ў залогу.

Новымі звесткамі дапоўніўся сёлета і шэраг паслуг Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Інфармацыю па паслузе аб працоўнай дзейнасці застрахаванай асобы, якая раней давалася толькі за год, цяпер можна атрымаць за апошнія два гады. З'явілася 20 адмінпрацэдур у галіне экалагічнай экспертызы (падчас прыёмкі будынка ў эксплуатацыю).

Са студзеня ўжо аказана больш як 1,5 мільёна паслуг дыспансерызацыі аднаго дня, якая даступная шляхам анкетавання (анкету можна запоўніць самастойна ў асабістым кабінеце або падчас прыёму ва ўрача). Пасля яе запаўнення сістэма выдасць пацыенту рэкамендацыі адносна выяўленай патэнцыяльнай рызыкі развіцця ў чалавека захворванняў сістэмы кровазвароту, лёгкіх, анкалогіі, цукровага дыябету.

Да канца года на партале з'явіцца яшчэ шэраг новых лічбавых працэдур, якія будуць даступныя на адзіным партале электронных паслуг, а да 2025-га — да іх павінна дадацца яшчэ амаль 450.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

Праграмны комплекс
НЦЭУ
«АДНО АКНО»
спрашчае ажыццяўленне адміністрацыйных працэдур

З дапамогай праграмнага комплексу «Адно акно» можна:
- ✓ прыняць заяву ў грамадзяніна з ID-карткай;
- ✓ запытаць дадатковыя звесткі ў электронным выглядзе;
- ✓ перанакіраваць заяву на выкананне іншаму работніку ПК «Адно акно»;
- ✓ фарміраваць аналітычныя даныя.

Падрабязней – на адзіным партале электронных паслуг
https://platform.gov.by

Нацыянальны цэнтр электронных паслуг. УНП 191700161

# Анлайн-кантроль і пераход на артэзіянскія крыніцы

## Чаму ў Мінску можна піць ваду з-пад крана?

**Спецыялісты адзначаюць, што ў Мінску з вадой усё ў поўным парадку. Яна мае высокую якасць, таму спажывец, не асцерагаючыся, можа піць яе проста з-пад крана. У сталіцы штогод ажыццяўляецца каля 20 тысяч адбораў проб вады для яе далейшага даследавання, паведаміў першы намеснік дырэктара — галоўны інжынер прадпрыемства «Мінскводаканал» Антон ГАЛАСКОК.**



Уся сістэма водазабеспячэння складаецца з больш чым 3 тысяч кіламетраў сетак, каля 450 помпавых станцый, якія забяспечваюць спажыўцоў горада вадой. Паводле яго слоў, асаблівая ўвага на прадпрыемстве аддаецца мадэрнізацыі асноўнага тэхналагічнага абсталявання: «Сярод прыярытэтаў — аўтаматызацыя працэсаў, якія дазваляюць забяспечыць бесперабойную работу аб'ектаў».

### Спецыяльныя пункты

«Вада даследуецца ў акрэдытаванай хіміка-бактэрыялагічнай лабараторыі», — распавёў спецыяліст. За год выконваецца больш за 180 тысяч даследаванняў вады. Па словах Антона Галаскока, такі маніторынг дазваляе аператыўна рэагаваць на змяненне якасці вады, у выпадку неабходнасці — прымаць меры.

Акрамя таго, паводле інфармацыі галоўнага інжынера, у Мінску існуюць асобныя пункты кантролю і маніторынгу за якасцю вады, якія працуюць у рэжыме анлайн.

«Дыспетчар у рэжыме рэальнага часу бачыць змяненне якасці вады і ў выпадку нейкай адмоўнай дынамікі прымае аператыўныя меры, каб не дапусціць яе пагаршэння ў спажыўцоў», — растлумачыў першы намеснік дырэктара.

### Апавяшчэнне аб аварыях і планавым рамонце

Антон Галаскок таксама паведаміў, што на прадпрыемстве рэалізаваны праект па апавяшчэнні спажыўцоў аб аварыях і планавых работах.

«Раней да нас неадназоава звярталіся з тым, што мы не інфармавалі аб аварыях. Мы ўбачылі, што ў гэтым плане ёсць наша недапрацоўка, і рэалізавалі алгарытм аўтаматычнага інфармавання спажыўцоў аб падобных адключэннях», — адзначыў ён.

Каб атрымліваць такія абвесткі, на афіцыйным сайце «Мінскводаканала» трэба прайсці нескладаную працэдуру рэгістрацыі, пасля якой на мабільны тэлефон будуць прыходзіць адпаведныя паведамленні.

### Сталічныя асаблівасці

Гаворачы аб водазабеспячэнні Мінска, Антон Галаскок адзначае шэраг асаблівасцяў. «У першую чаргу гэта наяўнасць дзвюх крыніц водазабеспячэння: падземныя і паверхневыя. Паверхневая крыніца водазабеспячэння прадстаўлена Вілейска-Мінскай воднай сістэмай, і для водазабеспячэння спажыўцоў і абанентаў, якія пражываюць у Фрунзенскім і Маскоўскім раёнах, вада атрымліваецца з Вілейскага вадасховішча. Прайшоўшы асобныя збудаванні водазабеспячэння і этапы водападрыхтоўкі, такая вада накіроўваецца спажыўцам.

Падземная крыніца водазабеспячэння прадстаўлена артэзіянскімі свідравінамі, згрупаванымі ў 17 буйных водазабораў, пяць з якіх знаходзяцца на тэрыторыі Мінска», — расказаў першы намеснік дырэктара — галоўны інжынер «Мінскводаканала».

### Чаму пахне хлоркай?

Адказваючы на пытанне аб якасці вады з паверхневых крыніц, першы намеснік дырэктара паведаміў, што гэтая вада цалкам адпавядае ўсім патрабаванням.

«Санітарнае заканадаўства жорстка рэгулюе ўсе патрабаванні да якасці вады, што падаецца спажыўцам і абанентам, і тая вада, якая сёння падаецца нашымі збудаваннямі, адпавядае дадзеным патрабаванням і нормам», — падкрэсліў ён.

Што датычыцца зваротаў жыхароў Фрунзенскага раёна беларускай сталіцы, то яны, па словах прадстаўніка «Мінскводаканала», нярэдка звязаныя з тым, што вада з паверхневай крыніцы ў абавязковым парадку павінна быць абеззаражана, а пры гэтым з'яўляецца пах хлору.

«Менавіта яго пах часта выклікае пытанні ў грамадзян, але мы тлумачым, што ўсё знаходзіцца ў дапушчальных межах», — паясніў спецыяліст.

### На артэзіянскія крыніцы — да 2025-га

«Згаданы праект у цяперашні час рэалізоўваецца. Я думаю, што тыя, хто праязджаў па кальцавой дарозе (асабліва ў бок Брэсцкай трасы), маглі звярнуць увагу, што там актыўна працуе будаўнічая тэхніка, пракладваюцца трубаправоды. Гэта якраз і ёсць адзін з этапаў рэалізацыі праекта па пераводзе Мінска на падземныя крыніцы», — распавёў Антон Галаскок.

Паводле яго слоў, сёння актыўна вядзецца работа па пракладцы сетак водазабеспячэння. «Цяпер праект знаходзіцца ў актыўнай стадыі рэалізацыі», — адзначыў першы намеснік дырэктара. Як паведамлялася раней, ажыццяўленне праекта поўнага пераводу Мінска на артэзіянскія крыніцы павінна быць завершана да 2025 года.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Разумныя грошы

# Абмяняць валюту з дэфектамі стала прасцей

## Пачаў дзейнічаць новы адзіны пералік прыкмет плацежнасці банкнотаў

**Гэты пералік распрацавала Асацыяцыя беларускіх банкаў і падрыхтавала шматбаковае пагадненне, якое прадугледжвае неабходнасць унясення з боку банкаў і і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый (НКФА) адпаведных змяненняў у лакальныя прававыя акты і прымянення ў практычнай дзейнасці адзіных прыкмет плацежнасці банкнотаў у замежнай валюце.**

Па выніках падпісання прадстаўнікамі фінансавай супольнасці названага пагаднення сфарміраваны рэестр банкаў і НКФА. Сёння да пагаднення далучыліся 17 банкаў і тры НКФА. Як паведамляе тэлеграм-канал найбуйнейшага банка краіны, той першы далучыўся да пагаднення. Сёння гэты фінансавы інстытут наватпадрыхтаваў каротную інструкцыю наконт таго, як карыстацца дадзеным пералікам.

### КАЛІ ЁСЦЬ НАДРЫВЫ

Вашу купюру прымуць, калі на ёй: не больш за пяць надрываў/надрэзаў даўжынёй не больш за тры міліметры альбо адзін надрыў/надрэз даўжынёй не больш за пяць міліметраў, у тым ліку залепленыя (залеплены) празрыстай ліпкай стужкай; ёсць праколы, адтуліны (не больш за тры) дыяметрам не больш за адзін міліметр кожны (-ая); не больш за тры візуальна бачныя малюнкі/надпісы, што складаюцца з літар, лічбаў, знакаў, сімвалаў, малюнкаў, штампаў, памер кожнага з якіх не перавышае памер квадрата старанай 10 міліметраў, або адзін малюнак/надпіс, памер якога не перавышае памеру квадрата стараной 20 міліметраў; не больш за адну візуальна бачную пляму, у тым ліку скразной, памер якой не перавышае квадрат стараной 10 міліметраў.

Павінны прыняць купюру, нават калі на ёй маюцца нязначныя пашкоджанні, такія як забрудненні з прычыны натуральнага зносу і знаходжання банкнотаў у абароце; пацёртасці (сціранне фарбавага пласта, ліній перагібу); маецца белае ці блакітнае свячэнне ва ўльтрафіялетавых прамянях (часткова або цалкам), пры гэтым структура паперы не парушаная, не рассыпаецца, не крышыцца.

### ТАКІЯ КУПЮРЫ НІКОМУ НЕ ПАТРЭБНЫЯ

Валюта адбіраецца, калі на ёй маюцца надпісы «Хабар», «Выкуп», «Рэкет», «Злодзей», абразлівыя, нецэнзурныя і іншыя надпісы, дамалёўкі і малюнкі, у тым ліку бачныя ва ўльтрафіялетавых прамянях, вонкавы выгляд і змест якіх абмяжоўваюць магчымасць рэалізацыі банкнотаў. Тое ж адбываецца з папяровай купюрай, калі яна афарбаваная спецыяльнай фарбай, што ўжываецца пры правядзенні следчых мерапрыемстваў.

Не размяняюць вам замежныя банкноты, разарваныя (разрэзаныя) на фрагменты/часткі, у тым ліку злепленыя празрыстай ліпкай стужкай. Будуць з'яўляцца проста «фанцікамі» купюры, якія маюць вытворчы брак: адсутнасць або непрадрукоўка ахоўных элементаў, змазанасць малюнка, неналежнае размяшчэнне вадзянога знака, адсутнасць (частковая адсутнасць) асобных элементаў абароны банкнота ад падробкі (вадзянога знака, галаграмы, кінеграмы, ахоўнай ніткі або стужак), памылка ў напісанні.

Не пройдуць кантроль замежныя купюры, дзе зменены геаметрычныя памеры як у бок павелічэння, так і ў бок змяншэння банкнота, у тым ліку якія страцілі ражкі, краі, фрагменты. А таксама змянілі першапачатковую афарбоўку, пашкоджаныя агнём, спарахнелыя, са слядамі выявдзення або спроб ачышчэння малюнкаў, вільготныя, ліпкія, злепленыя з іншымі банкнотамі.

Банкноты ў замежнай валюце, сапраўднасць якіх выклікае сумнеў або якія маюць відавочныя прыкметы падробкі, прад'яўніку не вяртаюцца і падлягаюць канфіскацыі ў адпаведнасці з заканадаўствам.

### АГУЛЬНЫ ПАДЫХОД

Банкам былі неабходныя агульныя правілы і падыходы. Цяпер яны зафіксаваныя ў адзіным пераліку. Да гэтага кожны банк меў свае правілы, якія банкноты лічыць непрыдатнымі. Так, яны складаліся на падставе патрабаванняў Нацыянальнага банка, замежных банкаў — партнёраў або банкаў-пасрэднікаў, з якімі заключаліся дагаворы на вываз банкнотаў. Але ўсё роўна адрозніваліся.

Сітуацыя абвастрылася пасля ўвядзення абмежаванняў: праз санкцыі стала больш складана вывозіць з краіны старыя і завозіць новыя купюры. Таму ў абароце з'явілася нямала банкнотаў з дэфектамі, якія па старых правілах банкі прымаць не маглі, кажуць спецыялісты.

Часам атрымлівалася так, што ў Беларусі можна было прымаць і выдаваць толькі банкноты з фактычна адсутным зносам, якія маюць нязначныя сляды натуральнага зносу ці ўвогуле без іх.



### КАМУ СТАНЕ ПРАСЦЕЙ, А КАМУ СКЛАДАНЕЙ?

Нам з вамі стане прасцей, бо прычын для адбракоўкі банкнотаў цяпер менш, а правілы сталі аднолькавымі для ўсіх банкаў, якія далучыліся да пераліку. Цяпер кліент можа быць упэўнены, што банкноты, дапусцім, са штампам, надрывам, надпісам, плямай або праколам прымуць у касе іншага банка без пытанняў. Акрамя таго, у абароце стане больш купюр, якія раней касірам даводзілася адхіляць.

Але і для банкаў гэта важны момант — адсутнасць «дваякіх азначэнняў і тлумачэнняў», у дакуменце ўсе крытэрыі падрабязна апісаны, таму супрацоўнікам на касах будзе прасцей абслугоўваць такія аперацыі, лічаць эксперты асацыяцыі.

### СВЯЧЭННЕ КУПЮР — САМЫ СПРЭЧНЫ МОМАНТ ПАМІЖ КАСІРАМ І КЛІЕНТАМ

Новыя правілы дапускаюць свячэнне банкнота, але з агаворкамі: «белае або блакітнае свячэнне ва ўльтрафіялетавых прамянях (часткова або цалкам), пры гэтым структура паперы не парушаная, не рассыпаецца, не крышыцца».

Цяпер кліентам не варта апасацца атрымаць у касе купюру, якую не прымуць у іншым банку. У банкаўскай супольнасці спадзяюцца, што шмат хто будзе разумець: купюры ў працэсе абароту могуць займець сляды натуральнага зносу, могуць пашкоджвацца, і гэта не стане праблемай пры паходзе ў абменны пункт.

Банкі таксама дамовіліся абнаўляць правілы: спецыялісты будуць назіраць, як працуюць змяненні, і прапаноўваць удакладняць спрэчныя моманты, калі яны ўзнікнуць.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ЯК ПАБУДАВАЦЬ ПРЫВАТНЫ ДОМ?

## ТОЛЬКІ НЕАБХОДНЫЯ ПАПЕРЫ

На працягу апошніх сямі гадоў аб'ёмы будаўніцтва індывідуальных жылых дамоў стабільна перавышаюць 40 % ад уводу ў эксплуатацыю агульнай плошчы жылля. У 2021 і 2022 гадах іх лічба дасягала каля 44 %. Лідарамі па будаўніцтве індывідуальнага жылля па выніках апошніх гадоў застаюцца Мінская, Брэсцкая і Гомельская вобласці. Згодна з планамі і ў адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай «Будаўніцтва жылля» ў 2023-м таксама павінна быць уведзена ў эксплуатацыю індывідуальных жылых дамоў не менш за 40 працэнтаў ад агульнай плошчы ўведзеных «квадратаў».

Паводле інфармацыі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі, у 2017—2022 гадах было пабудавана больш за 10 мільёнаў квадратных метраў агульнай плошчы індывідуальнага жылля. Гэта звыш 70 тысяч будынкаў. Такія тэмпы будаўніцтва прыватных дамоў немагчымыя без падвядзення да іх аб'ектаў інжынернай і транспартнай інфраструктуры (дарогі, лініі электра-, газа-, водазабеспячэння і водаадвядзення і іншыя). У 2023 годзе на згаданыя мэты запланавана выдаткаваць 223,3 мільёна рублёў. Гэта 25 % ад гадавога аб'ёму сродкаў, якія плануецца накіраваць на будаўніцтва такіх аб'ектаў для ўсіх дамоў.

Указ № 202 значна спрасціў будаўніцтва прыватных дамоў. Раней мы ўжо разбіралі яго асноўныя моманты. Калі сцісла, то на будучых жыхароў значна знізілася папяровая нагрузка: цяпер не трэба браць дазвол, распрацоўваць праект, узгадняць яго і праходзіць працэдуру ўводу ў эксплуатацыю ўзведзенага будынка. Для будаўніцтва ў сельскай мясцовасці дастаткова дакументаў аб праве на зямлю, а ў прыгарадных раёнах Мінска, гарадах і пасёлках гарадскога тыпу — пашпарт забудоўшчыка, які можна атрымаць у мясцовым выканкаме праз «Адно акно» за 25 базавых велічынь (925 рублёў). На будаўніцтва ў Мінску спрошчаны парадак не распаўсюджваецца. Такі ж падыход прымяняецца і пры будаўніцтве прыватных дамоў з дзяржаўнай падтрымкай.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па словах **начальніка ўпраўлення архітэктуры і будаўніцтва Мінскага райвыканкама Рамана ВАРАЎКІ**, нягледзячы на тое, што Указ № 202 дзейнічае ўжо больш за паўгода, нашы людзі ўсё яшчэ не занадта актыўна карыстаюцца спрошчаным парадкам.

— За ўвесь час дзеяння ўказа намі было атрымана ўсяго толькі 16 заявак на выдачу пашпарта забудоўшчыка, — адзначыў ён. — На мой погляд, людзі яшчэ не да канца разумеюць перавагі дадзенай працэдуры. Магчыма, многіх стрымлівае цана афармлення пашпарта забудоўшчыка, за які трэба аддаць амаль тысячу рублёў. Аднак калі праходзіць усе працэдуры па старым парадку, уключаючы распрацоўку праектнай дакументацыі, выдаткі склалі б не менш за 25 базавых, а можа, нават і больш. Атрыманне пашпарта забудоўшчыка спрашчае жыццё і людзям, і дзяржаўным органам.





**Буйны забудоўшчык мае магчымасць закупляць будматэрыялы оптам і ў вялікіх колькасцях. За кошт гэтага можна дамагчыся некаторай эканоміі.**

## ДАВЕРЫЦЦА ПРАФЕСІЯНАЛАМ

Яшчэ адна тэндэнцыя апошніх гадоў — будаўніцтва прыватнага дома перастае быць выключна клопатам яго будучых жыхароў. У нашай краіне актыўна развіваецца комплексная індывідуальная жылая забудова. Гэта калі буйны забудоўшчык атрымлівае зямельны ўчастак, сваімі сіламі забудоўвае яго аднакватэрнымі дамамі, а затым прадае іх. Такі падыход мае некалькі перавагі.

Па-першае, тэрыторыя забудоўваецца ў адзіным архітэктурным стылі. Па-другое, адначасова ўзводзяцца і элементы інфраструктуры. Па-трэцяе, дамы будуюць прафесіяналы з вялікім вопытам работы на розных аб'ектах, таму якасць будаўніцтва часта атрымліваецца вышэйшая, чым пры самастойным будаўніцтве. Да таго ж у буйных будаўнічых кампаніях, як правіла, наладжана сістэма вытворчага кантролю, што таксама павышае якасць выканання аб'екта.

Па-чацвёртае, буйны забудоўшчык мае магчымасць закупляць будматэрыялы оптам і ў вялікіх колькасцях. За кошт гэтага можна дамагчыся некаторай эканоміі. Па-пятае, для комплекснай забудовы, хутчэй за ўсё, выберуць тыпавыя праекты дамоў, якія добра зарэкамендавалі сябе як у працэсе ўзвядзення, так і пры эксплуатацыі. Таму верагоднасць таго, што прыйдзецца «на бягу» нешта перарабляць, істотна меншая. Гэта яшчэ адна крыніца эканоміі.

Дарэчы, каб не заблытацца ў нарматыўных патрабаваннях, Нацыянальнае кадастравае агенцтва распрацавала спецыяльны алгарытм, дзякуючы якому кожны жадаючы зможа вызначыць, ці падыходзіць яго будучы дом пад дзеянне Указа № 202. Таксама агенцтвам створана карта, з дапамогай якой можна даведацца, з чым можна пачынаць будаўніцтва: дакументам на зямлю або пашпартам забудоўшчыка.

**Нацыянальнае кадастравае агенцтва распрацавала спецыяльны алгарытм, дзякуючы якому кожны жадаючы зможа вызначыць, ці падыходзіць яго будучы дом пад дзеянне Указа № 202. Таксама агенцтвам створана карта, з дапамогай якой можна даведацца, з чым можна пачынаць будаўніцтва: дакументам на зямлю або пашпартам забудоўшчыка.**

## НА МІНШЧЫНЕ КІПІЦЬ РАБОТА

Як паведаміла **намеснік начальніка ўпраўлення архітэктуры і горадабудаўніцтва камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Мінскага аблвыканкама Аліна ВАРДОМСКАЯ**, у цэнтральным рэгіёне за першае паўгоддзе 2023-га пабудавана больш за 370 тысяч квадратных метраў, або 43 % ад агульнага аб'ёму ўводу ў эксплуатацыю індывідуальных жылых дамоў па краіне, і звыш 70 % ад уводу ў эксплуатацыю агульнай плошчы жылля па вобласці.

«Хацелася б адзначыць, што з ліку ўведзенага жылля прыкладна 26 % пабудавана з прыцягненнем дзяржаўнай падтрымкі. Гэта значыць грамадзяне актыўна карыстаюцца дапамогай дзяржавы. У прыватнасці, шматдзетныя сем'і», — заявіла спецыяліст.

Яна нагадала, што Указам № 240 прадугледжана фінансаванне будаўніцтва новых аб'ектаў, дзеянне дакумента не распаўсюджваецца на набыццё жылля на другасным рынку: «Гэта значыць дзяржаўная палітыка накіраваная ў першую чаргу на ўзвядзенне новых аб'ектаў, загрузку будаўнічых арганізацый, выкарыстанне ў будаўніцтве матэрыялаў беларускай вытворчасці».

На тэрыторыі Мінскай вобласці, падкрэсліла Аліна Вардомская, асаблівая ўвага аддаецца развіццю комплекснай індывідуальнай жылой забудовы. Да такога працэсу актыўна прыцягваюцца адзіныя забудоўшчыкі ў асобе УКБ і іншых дзяржарганізацый, якім зямельныя ўчасткі для гэтых мэт выдзяляюцца без аўкцыёну. Як прыклад спецыяліст прывяла Смалявіцкі райвыканкам, які падабраў зямельны ўчастак для комплекснай забудовы. Аліна Вардомская адзначыла, што ўжо сёлета тут было ўведзена ў эксплуатацыю 18 індывідуальных жылых дамоў. Такія ж зямельныя ўчасткі падабраныя таксама ў Крупскім, Нясвіжскім, Мінскім раёнах.

Выдзяляюцца сродкі ў Мінскім рэгіёне і на будаўніцтва інжынернай і транспартнай інфраструктуры для індывідуальнай жылой забудовы. Па словах намесніка начальніка ўпраўлення, сёлета на такія мэты прадугледжана выкарыстанне не менш за 31 мільён рублёў (больш за 227 мільёнаў рублёў у цэлым па краіне).

## ПАШПАРТ ЗАБУДОЎШЧЫКА АФАРМЛЯЕЦЦА ЗА МЕСЯЦ

Прастымуляваць індывідуальнае будаўніцтва, перакананыя спецыялісты, згодна з Указам № 202, павінна спрашчэнне парадку ўзвядзення і рэканструкцыі аднакватэрных жылых дамоў і гаспадарчых пабудоў пятага класа складанасці. «Механізм, прадугледжаны дакументам, карэнным чынам спрасціў падыходы да арганізацыі будаўнічага працэсу», — нагадала Аліна Вардомская.

**У цэлым жа агульная плошча прададзеных за другі квартал 2023 года кватэр склала 220 тысяч квадратных метраў, грашовае абарачэнне ад іх продажу склала 293 мільёны долараў у эквіваленце.**

Указам прадугледжана, што аднакватэрныя жылыя дамы і (або) нежылыя капітальныя пабудовы пятага класа складанасці на зямельных участках, выдзеленых для будаўніцтва і (або) абслугоўвання аднакватэрнага жылога дома, можна будзе пабудаваць або рэканструяваць без атрымання дазвольнай дакументацыі, без распрацоўкі праектнай дакументацыі і ўзгаднення яе з мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, без наступнай прыёмкі іх у эксплуатацыю. Выдача пашпарта забудоўшчыка ажыццяўляецца па прынцыпе «адно акно». Тэрмін афармлення займае адзін месяц.

Адказваючы на пытанне журналістаў аб цане будаўніцтва квадратнага метра індывідуальнага жылля, Аліна Вардомская адзначыла, што назваць канкрэтную суму вельмі складана. Яна залежыць ад інжынернага забеспячэння аб'екта, ад будматэрыялаў і іншых фактараў.

Як заўважыла спецыяліст, цяпер грамадзяне вывучаюць новую працэдуру. Актыўная работа ў дадзеным кірунку вядзецца на тэрыторыі Мінскага раёна. Ёсць станоўчыя зрухі ў Лагойскім, Салігорскім і Слуцкім раёнах Міншчыны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**У тэму**

### Названа цана самай дарагой кватэры ў сталіцы

Жыхары нашай краіны сталі часцей абзаводзіцца ўласным жыллём. Гэтаму спрыяе тое, што шэсць разоў з пачатку года зніжалася стаўка рэфінансавання, якая, у сваю чаргу, спрыяльна паўплывала на працэнты па крэдытах.

Дзяржкаммаёмасць назвала цану самай дарагой кватэры, прададзенай у Мінску з пачатку года. Самая «багатая» здзелка была здзейснена з кватэрай у жылым комплексе каля плошчы Перамогі — на вуліцы Кісялёва. Чатырохпакаёвыя апартаменты агульнай плошчай 124,1 «квадрата» абышліся ўладальніку ў 486 тысяч долараў, што стала новым рэкордам на рынку.

Цікава, што ў жылым комплексе на Кісялёва з красавіка да чэрвеня ўключна было прададзена яшчэ дзве кватэры. Цана метра ў іх склала ад 3680 да 4300 долараў у эквіваленце.

У цэлым жа агульная плошча прададзеных за другі квартал 2023 года кватэр склала 220 тысяч квадратных метраў, грашовае абарачэнне ад іх продажу склала 293 мільёны долараў у эквіваленце.

Колькасць здзелак за першае паўгоддзе практычна склала 7,5 тысячы, найбольшы попыт зарэгістраваны ў чэрвені — 1469. Нагадаем, за ўвесь мінулы год было прададзена амаль 15 тысяч кватэр у беларускай сталіцы.

Наш культурны асяродак
Жырандоля

# «МЯНЕ ЗАЎСЁДЫ ВАБІЛІ І КРЫХУ ПАЛОХАЛІ МАТЧЫНЫ ВОЧЫ...» ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТАЎ ГЕРОЯЎ «НОВАЙ ЗЯМЛІ»

**Сто гадоў таму быў скончаны і ўпершыню апублікаваны адзін з найвялікшых, а магчыма і самы значны з твораў беларускай літаратуры, які адлюстраваў самую сутнасць беларусаў — нацыянальны характар, народную філасофію, міфалогію, сялянскі побыт, харство беларускай прыроды... Паэма «Новая зямля» Якуба Коласа. Якраз гэтымі днямі, 23-24 ліпеня, Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа ладзіць святкаванні, прысвечаныя юбілею паэмы. Яна пісалася з 1911 да 1923-га, першыя радкі з'явіліся ў мінскім астрозе, дзе малады аўтар адбываў пакаранне за ўдзел у нелегальным настаўніцкім з'ездзе. Натхнялі паэта ўспаміны пра дзяцінства, якое прайшло на Стаўбцоўшчыне. «Мой родны кут, як ты мне мілы, забыць цябе не маю сілы!» Колас максімальна дакладна аднаўляў у вершах мілыя сэрцу краявіды, а таксама постаці сваіх родных і знаёмых. Але, як і ў кожным мастацкім творы, рэальнасць тут прапушчаная праз «магічны крышталь»... Давайце параўнаем партрэты некаторых герояў з іх прататыпамі.**



Маці Якуба Коласа, Ганна Юр'еўна Міцкевіч.

## Міхал



Бацька паэта, Міхал Казіміравіч Міцкевіч.

*«Міхал... вы лепш*
*спытайце самі*
*Пра палясоўшчыка*
*Міхала:*
*Яго ўся воласць*
*наша знала».*

Цэнтральны герой паэмы — ляснік Міхал. Менавіта яго надзея на ўласны кавалак зямлі стала сюжэтнай лініяй паэмы, яго смерцю і няздзейсненай марай яна і заканчваецца. Прававобразам паслужыў бацька Якуба Коласа Міхал Казіміравіч Міцкевіч. Які ж ён быў у жыцці? У кнізе Максіма Лужаніна «Колас расказвае пра сябе» цытуюцца словы аўтара паэмы: *«На нозі быў лёгкі і з'яўляўся заўсёды там, дзе яго і не чакалі парубшчыкі. Праз гэту ўвішнасць ды таму, што ён быў хударлявы, высах, бегаючы па лесе, мусіць, і далі яму мянушку «Струк». Магчыма, да мянушкі прычынілася яго кучаравасць. Але ўголас з яго гэтак не «выдзіраліся»... Баяліся, а можа і паважалі, бо ён ніколі лішняй крыўды не рабіў. Злавіўшы ў лесе парубшчыка з фурманкай, гужоў не сек, не здзекаваўся, як іншыя леснікі. Затое і адкупіцца ад яго залатоўкай ці паўквартай таксама не ўдавалася».*

Брат Якуба Коласа Міхась удакладняў у сваіх успамінах: *«Бацька і яговыя браты не адзначаліся фізічнай крэпасцю і былі нядоўгавечныя».* Так, цяжкая праца, вечныя перажыванні рана звялі Міхала ў магілу. Але бласлаўленне сыну на творчасць ён паспеў даць. Канстанцін Міхайлавіч успамінаў: *«Прачытаў яму свой верш за чужы. А ўжо як бацька ўпадабаў, я прызнаўся, што напісаў сам. Тады ён не паверыў ці прыкінуўся, што не верыць. Напэўна, хацеў памучыць мяне за ману.*

*У мяне слёзы на вачах, а бацька ўсё адно гаворыць: «Пакажы, адкуль спісаў». Нарэшце адпусціўся. Настрой у яго быў пад градусам, прыйшоў дадому, зрабіўшы візіт у карчму ці ў манапольку. Прыгарнуў мяне, пацалаваў: «Прабівай, кажа, дарогу, як можаш. На мяне спадзявацца няма чаго. У мяне багацця, як у шляхецкага жаніха: дзяркач лесу і зямля пад кіпцямі. Ды можа скора ў дзерваны кажух апранусся».*

*Бацька некалькі разоў так пра смерць загаворваў. Прадчуваў, што доўга не пацягне. Тады адваліў ён мне срэбны рубель. Хацеў, мусіць, даць менш, доўга перабіраў драбязу ў калітцы. Ганарар на тыя часы немаленькі, асабліва для пачаткоўца. Я і пазней з ахвотаю аддаваў бы вершы за такую цану».*

## Ганна

*«А маці слухае маўкліва,*
*Аб чымся думае тужліва;*
*Сказаць штось*
*хоча і ўздыхае,*
*Штось за язык*
*яе трымае...»*

Яшчэ адзін цэнтральны персанаж — Ганна, прататыпам якой стала маці паэта Ганна Юр'еўна Міцкевіч. Прывабны, светлы вобраз працавітай сялянкі. А вось што ўспамінаў пра яе сам Колас: *«Маці — Ганна Юр'еўна — была з роду Лёсікаў. Мяне заўсёды вабілі і крыху палохалі матчыны вочы. Добра яны глядзелі на нас, малых, але нібы наскрозь. Таму, калі мы рабілі якуюнебудзь шкоду і маці пачынала дашукавацца вінаватага, лепей было прызнавацца самому. Зірнеш ёй у вочы і зразумееш: маці ўсё ведае і так, а дапытваецца, бо хоча, каб ты сказаў праўду.*

*І другое, што ўражала больш за ўсё: матчын голас. Нават калі яна сварылася на нас і пачынала ўшчуваць, голас не трациў мяккасці і дабраты. Я вельмі любіў, як яна спявала».*

Вось удакладненне партрэта Ганны Міцкевіч: *«была фізічна крэпкай і здаровай, вытрывалай, цярплівай, лагоднай і ласкавай, мела й розум здаровы й прыродную інтэлігенцыю. Хоць вонкава яна не вельмі выказвала рэлігійнасць, але верыла ў Бога. Ад яе Колас дастаў і крэпасць фізічную і духовы склад натуры. Некаторыя ейныя выказванні, як «нічто з граніц сваіх не выйдзе, з законаў Богам напісаных», унесены Коласам у ягоную паэму «Новая зямля».*

## Дзядзька Антось

*«Наш дзядзька,*
*мілы наш Антоні,*
*Ў дзіцячым часта быў*
*палоне;*
*Вось так гуртом*
*яго абсядуць*
*І час работы яго крадуць».*

З вялікай сімпатыяй апісаны ў паэме дзядзька галоўнага героя Антоній. З паэмы мы даведваемся, што ён не займеў уласнай сям'і, бо не змог ажаніцца з дзяўчынай, якую пакахаў, а іншай не захацеў. Так і пражыў у сям'і брата.



Акінчыцы, месца нараджэння Якуба Коласа.

*«Дзядзька Антось быў у сям'і неацэнным дабрадзеем. Быў ён дбалым гаспадаром, быў майстрам зрабіць усякую рэч, патрэбную ў гаспадарцы, выконваў ролю выхаваўцы дзяцей, не беручыся за гэта фармальна»,* — успамінае брат Коласа. Сам жа Колас апісвае дзядзьку Антося так: *«Ростам быў невысокі, ніжэйшы за мяне. Нос — як упор у гэбліку, а пад носам — добрыя пышныя вусы. Валасы каштанавыя, даўгія, крыху хвалістыя, вочкі невялічкія, карыя».*

Колас з любасцю ўспамінае гульні і забаўкі з дзядзькам. Але быў і іншы ўплыў: *«Байкі Крылова падараваў мне дзядзька Антось. Як ён дагадзіў мне! Пабудзіў на досвітку і даў у рукі: «На, цешся!» А купіў ён кнігу ў нядзелю на кірмашы. Быў гэта, помніцца, дадатак да «Нівы», на кепскай паперы, з цьмяным шрыфтам. Але даражэйшага падарунка ў той час я сабе не ўяўляў. Кнігу ў Стоўбцах пераплялі, і я клаў яе ў торбачку, выбіраючыся на пасту».*

## Яська Базылёў

*«А сам дарэктар,*
*з вузел ростам,*
*Ў сваім уборы бедным,*
*простым,*
*У зрэбных портках*
*і кашулі,*
*Стаяў, як бы яго прыгнулі,*
*Такім мізэрным*
*і маўклівым,*
*У халаце суконным*
*сівым».*

Кранальным атрымаўся раздзел «Дарэктар» пра навучанне дзяцей, якіх трэба было адпраўляць у школу ў Мікалаеўшчыну.

*«Дома падлічылі, што наймаць кватэру ў Мікалаеўшчыне, карміць нас усіх там — задарага. І вырашылі ўзяць «дарэктара», балазе вучняў у нас была цэлая куча. Яська Базылёвых — гэтак па-вулічнаму звалі яго, а поўнасцю — Іван Васільевіч Міцкевіч. Добры потым настаўнік з яго выйшаў і таварыш слаўны, часта падтрымліваў мяне ў цяжкія часіны...»* — успамінаў Колас.

Сын тога Яські Базылёва, Мікола Міцкевіч, згадвае, як у пачатку 1920-х Колас прыязджаў з Мінска ў мястэчка Астрашыцкі Гарадок да яго хворага бацькі. А пасля смерці былога дарэктара Колас запрасіў яго сына пагасціваць у Мінск. У 1928—1933 гадах Мікола Міцкевіч жыў у Вайсковым завулку разам са старэйшым сынам пісьменніка — Данілам Канстанцінавічам: *«Я з вялікай прыемнасцю ўспамінаю тыя дні. Хоць і былі мы з Данілам аднагодкі, але ён як бы замяніў мне старэйшага брата. Пад яго ўплывам я рос, па яго парадзе стаў хімікам».*

Мікалай Іванавіч Міцкевіч стаў вядомым навукоўцам, фізікахімікам, доктарам педагагічных навук і прафесарам.

Аднойчы сакратар Якуба Коласа Максім Лужанін папрасіў паэта распавесці падрабязней пра тое хатняе навучанне. Колас паабяцаў напісаць «цыдулу»... Але замест яе Лужанін атрымаў вырваныя з «Новай зямлі» раздзелы: «Дарэктар» і «Начаткі».

*«На аркушыку, прыколатым да ўкладкі, было напісана і закрэслена некалькі радкоў, як відаць, пачатку «цыдулы»: «Вучыліся мы ў свайго «дарэктара» па-рознаму, пэўней кажучы, як хто мог і хацеў. Праўда, хаценне паддавала бацькава пружка...»*



Колас растлумачыў: падрабязней і яскравей, чым ён ужо апісаў у паэме, ён зрабіць не зможа.

## Костусь

І, зразумела, нельга не ўдакладніць партрэт самога галоўнага героя — дапытлівага, жвавага і ўражлівага хлопчыка Костуся, а гэта значыць, самога Якуба Коласа ў маленстве. Ягоны партрэт складаецца з мностыва фарбаў. Вось мы бачым, як ён углядаецца ў шэрань на шыбах:

*«Ўжо Костусь*
*двойчы неўзаметкі*
*Саскокваў з печы*
*на разведкі,*
*У вокны доўга*
*прыглядаўся,*
*Ў малюнкі так ён*
*углыбляўся,*
*Што ў іншы свет*
*перабіраўся.*
*На шыбе ўсё:*
*снапкі ржаныя,*
*Чароты хвацкія, буйныя,*
*І розных красак,*
*траў нямала.*
*У душу летам патыхала,*
*А з ім і вобразы другія*
*Ўставалі, сэрцу дарагія».*

Вось хлопчык радуецца зіме:

*«Цяпер гулянак свет раздольны,*
*Адкрыты новыя пуціны*
*У круг забаў яго дзяціны,*
*І ён ад радасці трасецца*
*Ды ў мяккім снезе*
*скачанецца».*

Вось шкадуе хвойкі, якія прыгнуліся пад цяжарам снегу:

*«Пагнуў вас снег,*
*мае хваінкі!*
*Эх вы, гаротныя*
*націнкі!»* —
*Над імі Костусь разважае,*
*І жаласць хлопца*
*пашыбае.*
*І ён да хвоек падбягае,*
*Сняжок з іх ціха атрасае».*

Вось герой злуецца, што не даецца вучоба:

*«Бо Костусь — хлопец нецярплівы, // У гнеў прыходзіць абурлівы».*

А якім у рэальным жыцці ён быў у вачах сяброў і сваякоў?

Гавораць, што з дзяцей Ганны і Міхала ён аказаўся крапчэйшым. *«Костусь змалку быў вельмі шустры й дасціпны; налажыўся скакаць з печы на пол, што для дзіцяці было досыць высока, таму часта набіваў сінякі й гузы».* Менавіта таму хросная маці, жонка падлоўчага Сянкевіча, што часта наведвала хросніка, называла яго «мой недабоечак». Адзначаюць і захапленне прыродай, мройлівасць. Сястра Алена згадвае, што сябры звалі Костуся «Стары» — шмат ведаў, умеў распавядаць, а яшчэ «яго нельга было не паслухацца. Меў ён да кожнага разумны падыход». Пры гэтым «у маладосці Костусь быў запальчывы. Нават мама гаварыла: «Як ты будзеш дзяцей вучыць?» А бачыце, якім настаўнікам стаў!»

«Новая зямля» — гэта цэлы сусвет... Абавязкова паспрабуйце зведаць яго.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Прэм'ера

# СПАКУСНІК І ІНШЫЯ

## Дамова, змацаваная крывёй, — у спектаклі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага

**Не, гэты стары расчараваны дзядзечка не застрэліцца — не дадуць. У яго павінен быць шанц на спазнанне свету, да чаго ён так імкнуўся, на салодкае жыццё і здзяйсненне любых жаданняў. Усё як шмат каму з людзей хацелася б, вось толькі не ўсе задумваюцца пра расплату за самай апошняй мяжой зямнога шляху. О, гэта самая вялікая таямніца, што там кага чакае...**



Далікатная Маргарыта не чакала паратунку, а сама сабе вынесла жорсткі прысуд за забойства дзіцяці, адмовілася выходзіць з-за кратаў разам з Фаўстам, якога кахала. І яна ўратаваная вышэйшымі сіламі? Так... Мала таго, той самы жорсткі сваволнік Фаўст, які імкнуўся спазнаць усё і нават больш за тое, што ёсць на зямлі, варты разумення? І ён заслугоўвае раю? Як такое наогул магчыма?.. А такое магчыма не толькі ў драме Гётэ «Фаўст». Такое магчыма, калі чалавек імкнецца зрабіць добрую справу для іншых, — паказваюць стваральнікі спектаклю «Фаўст. Змова з д'яблам», які з'явіўся ў рэпертуары Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага ў Мінску.



Нешта надта сур'ёзнае, падумае глядач, вырашаючы, ці варта ісці глядзець спектакль. А, магчыма, абыдзецца і без маралізатарства, — будзе разважаць ён, азнаёміўшыся з саставам пастановачнай групы, дзе рэжысёрам значыцца малады Дэвід Разумаў. Моладзь жа пазбягае нудоты... Але «Фаўст» — твор з магутным філасофскім падтэкстам, пра сэнс жыцця і расплату за зробленае. Каб ставіць такое, трэба прайсціпражыць пэўны шлях. Дык мо варта пацікавіцца менавіта тым, што цяпер хвалюе маладых рэжысёраў і як яны ўспрымаюць складаныя творы сусветнай літаратуры з вечнымі тэмамі пра дабро і зло, якія жывуць і змагаюцца ў чалавеку?..

Нямецкі паэт і драматург Іаган Вольфганг фон Гётэ быў вялікім гуманістам, калі, разважаючы пра шляхі, якія вядуць кагось у рай, а кагось у пекла, рыхтаваў прысуд для героя сваёй драмы доктара Фаўста. Той змог спазнаць усе прыемнасці жыцця, загубіць чыстую душу (за такое ніякіх думак пра рай наогул не магло быць), адчуў кроў на руках — і ўсё ж аўтарам для яго адведзена жыццё вечнае. Менавіта гэты персанаж і яго філасофскія развагі пра сэнс жыцця — у цэнтры ўвагі пісьменніка. У тэатры імя Горкага доктара Фаўста ўвасабляюць два акцёры.

Старога Фаўста, які імкнуўся спасцігнуць таямніцы быцця, здабываючы веды, але прыйшоў да расчаравання, іграе Аляксандр Палазкоў. Малады Фаўст — акцёр Кірыл Нікіцін — жыве пачуццямі, кідаецца ў крайнасці з-за спакус. Але само ўвасабленне гэтых спакус, знаўца чалавечых заган і калекцыянер чалавечых душ, якім няма ніякага даравання ніколі, — гэта Мефістофель.

У Гётэ злы дэман — нібыта служка ў Фаўста, які падштурхоўвае яго да пэўных дзеянняў. Тут жа ён нібыта робіць тое самае, але фактычна становіцца галоўным героем, які кіруе лёсам Фаўста (хай і з яго згоды). Менавіта Мефістофель у спектаклі «Фаўст. Змова з д'яблам» тэатра Горкага — той персанаж, у якога слухаеш усе маналогі, ловіш кожную рэпліку (вось жа і сапраўды спакуса!), за існаваннем якога на сцэне хочаца назіраць вельмі ўважліва, бо істотна тое, дзе і як ён узнікае, як рухаецца, як усміхаецца ці дэманструе абыякавасць. Яго іграе заслужаны артыст Беларусі Сяргей Чэкерэс. І такое адчуванне, што ў гэтую ролю ён уклаў увесь свой талент, усе свае акцёрскія здабыткі, усю сваю чалавечую апантанасць і разважлівасць. А без іх нельга данесці ў залу ўсё, што патрэбна, — то гучна, нібыта прапякаючы словам, то рашуча і ўпэўнена, то ціха, амаль шэптам. Асноўнае тут — думкі пра слабасць роду чалавечага і пра магчымасць даравання і вышэйшага выратавання. А яно адбываецца на нашых вачах двойчы — цуд, што бянтэжыць самога Мефістофеля. І менавіта праз гэты персанаж (нібыта ў спрэчцы з ім) выяўляецца самая галоўная (але нябачная) сіла, якая выносіць свой канчатковы прысуд, — з любоўю да чалавека. Мы чуем голас таго, да каго злы дэман звяртаецца як да ўладара Сусвету з просьбай заняцца адной разгубленай душой. І гэта голас дзіцяці... Калі нейкі класічны твор набывае тэатральнае ўвасабленне, то не выключана, што ў ім будзе нейкая адмысловая інтэрпрэтацыя, а «Фаўст» такія магчымасці мае. Тым не менш рэжысёрская задума выйшла блізкай па духу Гётэ — найперш дзякуючы акцэнтам, якія атрымаліся ў спектаклі. Іх няшмат — спектакль мінімалістычны (мастак-пастаноўшчык спектакля Таццяна Стысіна). Але ёсць дэталі вельмі красамоўныя — найперш, святло, скіраванае на акцёраў у пэўныя моманты, чырвоная дарожка, якая лёгка ператвараецца ў мантыю і вылучаецца на чорным фоне, і музыка. Так, калі добра падумаць, можна сёе-тое пазнаць і параўнаць з існаваўшым раней. Аднак больш істотнае тое, як створанае працуе на задуму. А тут усё даволі стрымана.



Праўда, маладога рэжысёра выдаюць нейкія дзіўныя фантасмагарычныя вобразы (як дэманыпачвары ў духу галівудскіх фільмаў) — нешта чужароднае гэтаму спектаклю, нібыта з іншага твора. І разам з тым можна падзякаваць яму за факт работы з вельмі няпростым і сур'ёзным творам, асабліва з улікам таго матэрыялу, якому цяпер аддаюць перавагу тэатры. Нарэшце нам нагадалі: тэатр — не толькі дзеля забавы, ён яшчэ і дзеля думкі. І зрабіў гэта малады чалавек, а моладзь мы звычайна звязваем з легкадумнасцю — дык жа няпраўда! Калі чалавеку дадзены розум, яму ўсё ж хочацца сілкаваць яго энергію. Дэвід Разумаў скончыў у 2019 годзе Беларускую акадэмію мастацтваў, некалькі гадоў працуе ў тэатры як акцёр. А насамрэч вучыўся рэжысуры на курсе Сяргея Кавальчыка, які з'яўляецца мастацкім кіраўніком Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Горкага. У Дэвіда Разумава ўжо была магчымасць паспрабаваць сябе ў рэжысуры, але з аўтарскім творам, дзе ён мог дазволіць сабе любыя пошукі. Іншая справа — «Фаўст. Змова з д'яблам». Класічная літаратурная аснова засталася (вершаваныя радкі ў перакладзе на рускую), каб паказаць асноўныя этапы, якія праходзіць галоўны герой, перш чым вышэйшыя сілы ўратуюць яго, нягледзячы на безліч грахоў і кроў на руках. А вось Мефістофелю, які жыве вечна, не пашчасціла: яго чакае новы круг. Ну і няхай вучыцца любіць людзей. Хоць бы па-свойму.

Каб увасобіць на сцэне твор, напісаны амаль дзвесце гадоў таму, давялося зрабіць так, каб дзеянне адбывалася нібыта па-за часам: умоўныя дэкарацыі, усё адбываецца недзе ў цёмнай прасторы Сусвету. Лагічна: такое магло быць і тысячу гадоў таму, і сто, і ў наш час — людзям жа ўласціва шукаць сэнс жыцця, спрабуючы спазнаць усе яго радасці: каханне, задавальненне, славу, уладу... І далёка не ўсе прыходзяць у канцы да таго, што захацеў зрабіць Фаўст, каб спыніць самае галоўнае імгненне ў жыцці.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

З нагоды

# ПРЫЗНАННЕ КАМПАЗІТАРУ МОВАЙ МУЗЫКІ

**На «Славянскім базары ў Віцебску» ў рамках Дзён Саюзнай дзяржавы прайшоў канцэрт, прысвечаны 85-годдзю з дня нараджэння вялікага кампазітара, народнага артыста СССР Ігара Лучанка.**

Падчас памятнага вечара на сцэне Летняга амфітэатра прагучалі новыя аранжыроўкі яго найлепшых твораў, сярод якіх — вядомыя і любімыя «Жураўлі на Палессе ляцяць», «Мой родны кут», «Майскі вальс» і шэраг іншых вядомых усім народам былой Савецкай Рэспублікі шлягераў.

«Я вырасла на творчасці Ігара Лучанка, з яго песнямі прайшлі мае юнацтва і маладосць. Падчас падрыхтоўкі да свята ўзняла шмат яго матэрыялаў: 80 працэнтаў напісанага — песні, якія слухаў увесь Савецкі Саюз. Але мне раптам захацелася дакрануцца не толькі да эстраднай творчасці, але і паказаць хоць бы краечкам іншыя кірункі, у якіх працаваў народны артыст, напрыклад, — інструментальны, рамансавы. Ігар Лучанок — разнапланавы кампазітар», — расказала рэжысёр канцэрта Маргарыта Жалязнова.

Многія артысты сказалі нямала добрых слоў аб кампазітары. Зара, Анатоль Ярмоленка і ансамблі «Сябры», «Песняры», Алена Ваенга, Жанет і іншыя выканаўцы аддалі даніну павагі таленту маэстра, прадставіўшы на сцэне яго цудоўныя і ўсімі любімыя кампазіцыі ў суправаджэнні заслужаных харэаграфічных калектываў Беларусі і Расіі.

Ігар Лучанок быў выдатным настаўнікам, імкнуўся ўсім дапамагчы, а ў дадатак да высокіх чалавечых якасцяў пісаў цудоўныя песні. Народны артыст Анатоль Ярмоленка падкрэсліў, што кампазітар быў геніем нашага часу. «Для мяне Аляксандра Пахмутава і Ігар Лучанок — нібы краевугольныя камяні, на якіх стаіць наша песенная культура. На «Славянскім базары ў Віцебску» прагучала прэм'ера песні Ігара Лучанка «Беларуская сталіца». Творы вялікага кампазітара гучалі і будуць гучаць».

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

Приорбанк RBI Group

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС 30 июня 2023 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 30 июня 2023 г. | 1 января 2023 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 1 027 977 | 726 253 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 1 019 024 | 1 609 453 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 2 949 781 | 1 607 565 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 386 890 | 1 412 801 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 2 050 913 | 1 817 498 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 10 | 3 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 25 780 | 25 781 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 190 117 | 185 605 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 473 | 788 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 899 | 1 365 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 30 117 | 50 169 |
| 15 | **ИТОГО активы** | **11** | | **7 681 981** | **7 437 281** |
| 15 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | 1 230 | 189 |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 248 530 | 268 580 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 5 886 491 | 5 786 326 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 310 | 1310 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 71 | 238 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 57 940 | 80 292 |
| 23 | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **6 194 572** | **6 136 935** |
| 24 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 86 148 | 86 148 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 180 609 | 180 609 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 81 928 | 79 028 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 1 138 724 | 954 561 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 1 487 409 | 1 300 346 |
| 31 | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **7 681 981** | **7 437 281** |

## ОТЧЕТ о прибылях и убытках 30 июня 2023 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 30 июня 2023 г. | 30 июня 2022 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 142 793 | 193 894 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 8 658 | 45 000 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 134 135 | 148 894 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 193 643 | 149 577 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 81 112 | 71 910 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 112 531 | 77 667 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (42 490) | 657 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 119 664 | 134 608 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (247) | 17 771 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 14 867 | 54 334 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 37 385 | 4 694 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 111 109 | 97 501 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 4 189 | 6 878 |
| 15 | Прибыль до налогообложения | 211 | | 230 813 | 225 578 |
| 16 | Расход по налогу на прибыль | 212 | | 46 582 | 43 905 |
| 17 | **ПРИБЫЛЬ** | **2** | | **184 231** | **181 673** |

Председатель Правления В.Б. Матюшкин

Главный бухгалтер В.В. Манцивода

Финансовая отчетность размещена на интернет-странице банка: **https://www.priorbank.by/priorbank-main/business-information/bank-reporting/kvartal-nye-otcety**

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 24.02.2023 года. УНП 100220190

# ИЗВЕЩЕНИЕ

## о проведении повторного открытого аукциона

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» –

**11 августа 2023 года в 11.00**

проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Стоимость с учетом снижения на 70 %, без НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот 1 | Автомобиль «GAZ-5201», тип ТС – грузовой специальный цистерна, номер кузова (vin) 0906663, цвет – голубой, год выпуска – 1986, инвентарный № 2101 | 1470,00 | 147,00 |
| Лот 2 | Автомобиль «ZIL-431412», тип ТС – грузовой специальный цистерна, номер кузова (vin) XTZ431412R3392697, цвет – белый, год выпуска – 1994, инвентарный № 2039 | 1890,00 | 189,00 |
| Лот 3 | Автомобиль «MAZ 5337», тип ТС – грузовой специальный машина дорожная комбинированная, номер кузова (vin) Y3M533700Y0037768, цвет – белый, год выпуска – 2000, инвентарный № 1967 | 3000,00 | 300,00 |
| Лот 5 | Каток Амкодор 6223А, заводской (серийный, идентификационный) номер – 0506003, год выпуска – 2006, инвентарный номер 4030 | 6120,00 | 612,00 |
| Лот 6 | Автогрейдер ГС-14.02, заводской номер – 070090, год выпуска – 2007, инвентарный номер 1415 | 19 380,00 | 1938,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 802220712424.

2. Дата, время и место проведения аукциона **11 августа 2023 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.

3. Местонахождение имущества: г. Могилев, Славгородский проезд, 17.

4. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).

5. Участник аукциона за 3 рабочих дня до проведения аукциона должен подать заявление на участие в аукционе, подписать с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607

6. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **07.08.2023 г., время: 17.00.**

7. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

8. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.

9. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

10. Ссылка на ранее опубликованное извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3»: в газете «Звязда» от 20.06.2023, а также на сайте ОАО «ДСТ № 3».

**ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению Лоевского РайПО (продавец) извещает о проведении 2 августа 2023 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2**

**Лот № 1**: капитальное строение с инв. № 340/С-24859, площадью 392,5 кв. м, (магазин № 8 «Хозтовары», назначение – здание специализированное розничной торговли), расположенное на земельном участке с кадастровым № 323055100001003139 по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Горького, 19.

Стеллажи металлические, инв. № 130 (21 шт.), котел отопительный, инв. № 136, козырек (козырек маг 8), инв. № ЛО0000423.

**Начальная цена** продажи без НДС – **43 082,50** бел. руб. **Задаток 10 % – 4 308,25** бел. руб.

**Продавец: Лоевское районное потребительское общество**, г. п. Лоев, ул. Батова, 59. Конт. тел.: +375 44 717-81-55, +375 29 345-09-66.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо: 1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 01.08.2023 г. в 17.00.** Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте: www.deloocenka.by.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу согласно договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем, будет учтен в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62**

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества **ООО «БТМ Трейдинг»** (УНП 192433644), объявляет о проведении **03.08.2023 г.** в 10.00 публичных торгов по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501.

**Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2023/07/btm-trejding.pdf**

Продавец: ООО «БТМ Трейдинг».

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; тел. +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **02.08.2023 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **24.07.23** по 17.00 **02.08.23** по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501. К заявке на участие в торгах прилагаются (для юридических лиц) следующие документы:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета торгов, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Затраты на организацию и проведение торгов составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре, публикация в СМИ – 128,40 бел. руб., аукционный сбор – 7 % от цены реализации предмета торгов без учета НДС (НДС 20 %).

Срок подписания договора купли-продажи: в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 15 календарных дней с даты проведения торгов.

### Извещение о проведении электронных торгов в форме открытого аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона и оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б, УНП 191224638 (www.ipmtorgi.by) |
| **Продавец** | ООО «Риетуму Лизинг», г. Минск, ул. Одоевского, д. 117, 6-й этаж, каб. 9, УНП 100188077 |

**Предмет электронного аукциона**

**Изолированное помещение**

(торговое помещение, общ. пл. 1458,8 кв. м, инв. № 300/D-3384).

Адрес: **Гомельская обл., г. Гомель, ул. Царикова, 5А**

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 459 000,00 долларов США**

*Примечание: цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона

**Обременение:** площади помещения частично сданы в аренду. Помещение находится в залоге у АО «Риетуму Банка». Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

**Задаток 5000,00** бел. руб. перечисляется на р/с BY92BELB301200483500 80226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X; УНП 191224638; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты и передачи предмета электронных торгов**

Оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) рабочих дней** с момента вступления договора купли-продажи недвижимого имущества в силу. Обязанность по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности на недвижимое имущество и расходы в связи с данными регистрационными действиями относятся на покупателя. В течение **10 (десяти) рабочих дней** по факту полной оплаты покупателем стоимости недвижимого имущества по договору купли-продажи Продавец обязуется передать недвижимое имущество покупателю, не обремененное ипотекой

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в размере 1 % от цены продажи предмета электронных торгов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов – 23.08.2023 в 11.00. Окончание торгов – 23.08.2023 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 22.08.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: + 375 (17) 272 24 10, +375 (44) 704 92 06, info@ipmtorgi.by**

Центр Промышленной Оценки

- **ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
- **ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

**Извещение о проведении повторных электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | УП «НАЦИОНАЛЬНЫЕ СПОРТИВНЫЕ ЛОТЕРЕИ», г. Минск, пр-т Независимости, 49, пом. 25, +375 29 607 75 72 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов: прицеп-фургон «КУПАВА» 8132 51**, № кузова Y3H81325150035773, 2005 г. в., р/зн. М3566А, по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 49. **Начальная цена с НДС – 5 040,00 бел. руб. (снижена на 30 %). Шаг электронных торгов** составляет **5 %** от начальной цены предмета электронных торгов

**Задаток** для участия в электронных торгах перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 04.08.2023**. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by по **03.08.2023 до 17.00**

**Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу (http://gki.gov.by) 20.07.2023 г.**

**Контактные телефоны: +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

# Паміж «Цэрберам» і «Харонам»

## Чаму разгарнулася глабальная хваля спёкі?

**У выніку «цеплавога выбуху» ў Афрыцы тэмпература ў Еўрапейскім Міжземнамор'і падскочыла да 50 градусаў. Тэмпературныя рэкорды абнаўляюцца ледзь не штодня. Вінаватым у анамальнай спёцы стаў паўночнаафрыканскі антыцыклон «Харон», якога назвалі ў гонар персанажа старажытнагрэчаскай міфалогіі — перавозчыка душ у замагільнае царства. Раней тут уладарыў бязлітасны «Цэрбер». Але хваля спякоты не абмяжоўваецца Еўропай — у Паўночнай Амерыцы і Паўночнай Азіі таксама рэгіструюцца анамальна высокія тэмпературы, нават вышэйшыя, чым у Старым Свеце. Ад Каліфорніі да Кітая ўлады папярэджваюць аб небяспецы для здароўя экстрэмальнай гарачыні, заклікаючы людзей ужываць больш вадкасці і хавацца ад пякучага сонца. Чаму разгарнулася глабальная хваля спёкі, чаго чакаць надалей?**




### СВЕТ ПЕРАТВАРАЕЦЦА Ў ДАЛІНУ СМЕРЦІ

У Італіі, Іспаніі, Францыі, Грэцыі людзей заклікаюць піць шмат вады і не выходзіць на вуліцу ў самы спякотны час. Жыхароў папярэджваюць аб верагоднасці пажараў і збояў інфраструктуры. У горных раёнах Італіі, на Сардзініі і Сіцыліі спякота дасягнула 45-46 градусаў. Гэта на 8-10 градусаў вышэй за сярэднія тэмпературы ў цяперашні час. Нават у Рыме паказчыкі зашкальваюць. «Гэта не Вечны, а пякельны горад», — уздыхаюць мясцовыя і турысты ды шукаюць паратунку ў сусветна знакамітых фантанах.

У Францыі ва ўмовах страшэннай спякоты былі ўведзены павышаны ўзровень небяспекі надвор'я ў паўднёвых дэпартаментах краіны, паведамляе Le Monde. У тым ліку гэта закранула Праванс і Корсіку, дзе нават ноччу захоўваецца 27 цяпла. З-за рызык засухі ўлады ўводзяць абмежаванні на выкарыстанне вады і заклікаюць французаў яе эканоміць. У паўднёвых дэпартаментах з самай высокай тэмпературай забаранілі «непрыярытэтнае» спажыванне, уключаючы нават патрэбы сельскай гаспадаркі.

У некаторых раёнах Іспаніі тэмпература перасягае норму на 15 градусаў. У Грэцыі з-за анамальнага пацяплення і моцнага ветру ўзніклі пажары. Вельмі высокая тэмпература зарэгістраваная ў правінцыях Адана і Дыярбакыр на поўдні і паўднёвым усходзе Турцыі. Напярэдадні тэрмометры паказвалі адпаведна 52 і 48 градусаў. Ад нясцерпнай спякоты пакутуюць не толькі людзі, але і жывёлы, пустуюць вуліцы і плошчы, піша газета Hurriyet. Цеплавы фон, які ахапіў краіну, прывёў да рэкордных узроўняў спажывання электраэнергіі. Да таго ж штодзень узнікаюць шматлікія лясныя пажары. «У Дыярбакыры быў адзін з самых гарачых дзён за ўсю яго гісторыю. У горадзе, дзе тэмпература дасягала 48 градусаў, вуліцы і плошчы заставаліся пустымі на працягу ўсяго дня. У Адане, дзе тэрмометры паказвалі 52 градусы, ад спякоты пакутуюць не толькі людзі, але і жывёлы. Фермеры паліваюць іх са шлангаў», — адзначае Hurriyet.

Анамальнае надвор'е ў ліпені фіксуецца і ў іншых краінах Паўночнага паўшар'я — у Кітаі, Канадзе і ЗША. У Злучаных Штатах з-за цеплавога купала на паўднёвым захадзе мільёны людзей аказаліся ва ўмовах экстрэмальнай спякоты. Сіноптыкі кажуць, што тэмпературныя рэкорды, верагодна, будуць пабітыя. У мінулую нядзелю тэмпература паветра ў Даліне Смерці ў Каліфорніі дасягнула +53,9 °С. Гэта пакуль не перашкаджае турыстам прыязджаць туды, каб адчуць на сабе ўздзеянне моцнай спёкі і сфатаграфавацца перад лічбавым дысплэем, які паказвае неверагодныя градусы Цэльсія. Даліна Смерці — месца з найвышэйшай тэмпературай, якую калі-небудзь дакладна зарэгістравалі на планеце. Яшчэ ў 1913-м яна дасягнула 56,7 градуса.

Сусветная метэаралагічная арганізацыя (World Meteorological Organization, WMO), якая з'яўляецца спецыялізаваным падраздзяленнем ААН, папярэджвае, што спякота, якая ўсталявалася ў рэгіёне Міжземнага мора, узмоцніцца і працягнецца ў жніўні, перадае Міжнароднае французскае радыё (RFI). «Інтэнсіўнасць гэтых з'яў будзе працягваць расці», — папярэдзіў старшы саветнік СМА па пытаннях экстрэмальнай спякоты Джон Нэрн. Экстрэмальнае надвор'е, выкліканае глабальным пацяпленнем клімату, «на жаль, становіцца новай нормай». Такую заяву зрабілі ў Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі. Як адзначыў eadaily.com, свет насамрэч ператвараецца ў Даліну Смерці.

«Глабальныя тэмпературы цяпер вышэйшыя, чым былі ў мінулым, чым Эль-Ніньё ў 1980-х. Такім чынам, глабальная тэндэнцыя працягвае расці, — заўважыў спецыяліст па экстрэмальным надвор'і і клімаце Джон Нэрн. — Таму я не ведаю, ці можам мы на самай справе казаць аб «нармальнасці». Проста будзе станавіцца ўсё цяплей».



### ТЭМПЕРАТУРНЫ ВЫБУХ

Дадзены выбух гарачыні — сведчанне таго, што адбываюцца глабальныя змены клімату, якія вядуць да пачашчэння і большай інтэнсіўнасці, большага размаху хваль спякоты, хваль цяпла. Аб гэтым распавёў gazeta.ru кіраўнік прагнастычнага цэнтра «Метэа» Аляксандр Шувалаў. Па словах спецыяліста, антыцыклон «Харон» сведчыць аб павелічэнні працягласці і частаты гарачых і сухіх перыядаў, якія ўсталёўваюцца ў некаторых раёнах Зямлі. З-за пацяплення можа павялічыцца колькасць пажараў, як тое цяпер адбываецца ў Канадзе.

З анамальна спякотным надвор'ем з-за «цеплавога выбуху» ў Сахары перш за ўсё сутыкнуцца жыхары Заходняй Еўропы і Кітая, распавёў Daily Storm навуковы кіраўнік Гідраметцэнтра Расіі Раман Вільфанд. Паводле яго слоў, гэта звязана з трэндам на глабальнае пацяпленне і павелічэннем «паўтаральнасці хваль цяпла». «Клімат — сталы джэнтльмен, які ходзіць з кійком, але ўпэўнена. І з'яўляецца трэнд на пацяпленне. Клімат цяплее, а надвор'е на фоне такога трэнду часцей становіцца альбо вельмі гарачым, альбо вельмі халодным. Зменлівасць надвор'я — фактар, які будзе суправаджаць пацяпленне клімату да канца гэтага стагоддзя. І да яго трэба адаптавацца», — адзначыў Вільфанд.

Анамальная спякота, якая ўсталявалася па ўсёй планеце, вядзе да ўзнікнення ланцуговай рэакцыі і выкліча мноства экстрэмальных з'яў надвор'я, у тым ліку тых, якія раней не назіраліся, піша выданне «Чжунга Цынянь баа» са спасылкай на кітайскіх экспертаў. Раней Кітайскае метэаралагічнае ўпраўленне паведаміла, што рэкордна высокая за ўвесь час метэаралагічных назіранняў у Кітаі ліпеньская тэмпература была зафіксавана ў мінулую нядзелю ў Сіньцзян-Уйгурскім аўтаномным раёне, дзе слупок тэрмометра дасягнуў адзнакі 52,2 градуса. Папярэдні рэкорд тэмпературы ліпеня быў устаноўлены ў Кітаі ў 2017 годзе, тады яна дасягнула 50,6 градуса.

Нядаўна ў горадзе Гуян кітайскай паўднёва-заходняй правінцыі Гуйчжоу адбыўся форум па экалагічнай цывілізацыі, дзе эксперты абмеркавалі цэлы комплекс пытанняў, звязаных са змяненнем клімату і экстрэмальнымі ўмовамі надвор'я. Як піша па выніках форуму «Чжунга Цынянь баа», некаторыя метэаролагі заявілі аб тым, што, за выключэннем экстрэмальных халадоў, частата і інтэнсіўнасць экстрэмальных з'яў надвор'я, уключаючы экстрэмальную спякоту, надзвычай моцныя ападкі і павышэнне ўзроўню мора, у асноўным павялічваюцца. Галоўны навуковы супрацоўнік Кітайскага нацыянальнага кліматычнага цэнтра Сунь Ін пяць гадоў таму праводзіла даследаванне змяненняў надвор'я пры тэмпературы, вышэйшай за 35 градусаў па Цэльсію, якое паказала, што ў будучым анамальная спёка будзе пачынацца раней і заканчвацца пазней, а колькасць дзён з высокай тэмпературай будзе павялічвацца. Пры гэтым навукоўцы не чакалі, што перамены адбудуцца так хутка.

Сунь Ін, якая жыве ў Пекіне больш за 20 гадоў і ўвесь гэты час займаецца даследаваннямі змянення клімату, была здзіўленая, што сёлета экстрэмальна спякотная тэмпература ўсталявалася ў кітайскай сталіцы вельмі рана. «Зафіксаваныя ў мінулым годзе і ў гэтым годзе высокія тэмпературы вельмі ненармальныя», — заявіла на форуме Сунь Ін, адзначыўшы, што летась рэкордна высокая тэмпература фіксавалася ў басейне ракі Янцзы, а сёлета аналагічная з'ява адбываецца ўжо і на поўначы Кітая.

Высокая тэмпература, адзначылі навукоўцы, выклікае серыю ланцуговых рэакцый. Напрыклад, экстрэмальная спякота летась прывяла да моцнай засухі ў басейне ракі Янцзы, у вадаёмах упаў узровень вады, пацярпела вытворчасць гідраэлектраэнергіі, і нават у правінцыі Сычуань, якая з'яўляецца буйным вытворцам электраэнергіі, быў яе недахоп. Таксама ў розных рэгіёнах узнікалі лясныя пажары.

Сунь Ін падлічыла, што «з кожным градусам павышэння тэмпературы вільгацяёмістасць атмасферы будзе павялічвацца на сем працэнтаў, а гэта азначае, што павялічыцца і колькасць экстрэмальных ападкаў». Памочнік генеральнага сакратара Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі Чжан Вэньцзянь паведаміў, што цяпер штогод адбываецца 244 тайфуны чацвёртай і пятай катэгорый. Калі ж у будучым тэмпература павысіцца на тры градусы, штогод можна чакаць больш як 300 тайфунаў, і іх інтэнсіўнасць таксама ўзрасце.

Навуковы супрацоўнік Кітайскай акадэміі метэаралагічных навук, сустаршыня першай Міжурадавай групы экспертаў па змяненні клімату Чжай Паньмаа, у сваю чаргу, адзначыў, што па меры ўзмацнення глабальнага пацяплення многія змяненні ў кліматычнай сістэме будуць узмацняцца, а таксама могуць узнікаць экстрэмальныя з'явы надвор'я, якія раней не назіраліся.

Эксперты сышліся на думцы, што асноўнай прычынай змены клімату на планеце па-ранейшаму з'яўляюцца выкіды парніковых газаў. Сунь Ін адзначыла, што парніковыя газы падобныя да тоўстай коўдры, і «гіганцкая коўдра», якая пакрывае Зямлю, становіцца ўсё таўсцейшай.

Чжай Паньмаа адзначыў, што перш чым будзе дасягнута глабальная вугляродная нейтральнасць, «прынамсі, у наступныя 30-40 гадоў мы будзем сутыкацца з усё большай і большай колькасцю праблем, звязаных з экстрэмальнымі з'явамі надвор'я, таму ўжо цяпер мы павінны праводзіць работу па раннім папярэджанні і прадухіленні».

Эксперты мяркуюць, што, акрамя прагназавання надвор'я, метэаралагічная супольнасць таксама павінна займацца прагназаваннем экстрэмальных з'яў надвор'я. Пры гэтым Сунь Ін лічыць, што неабходна павышаць узровень адукацыі і дасведчанасці насельніцтва аб негатыўным уплыве на арганізм экстрэмальна высокіх або нізкіх тэмператур, аб небяспецы ліўняў. Паводле яе слоў, многія людзі з-за недасведчанасці спакойна выходзяць на вуліцу гуляць у моцную гарачыню, нават калі ў іх у тым няма асаблівай неабходнасці і яны могуць перачакаць у памяшканні.

### КЛІМАТЫЧНЫЯ МІГРАНТЫ

Пры найгоршым сцэнарыі змяненні клімату да канца XXI стагоддзя каля трох мільярдаў чалавек будзе вымушана змяніць месца жыхарства, паведаміў РІА «Навіны» кліматолаг Аляксей Какорын. «Калі ніякіх намаганняў не будзе прыкладацца, калі ўсё пойдзе па самым горшым сцэнарыі, да канца стагоддзя будзе тры мільярды мігрантаў. Гэта значыць каля 30 працэнтаў насельніцтва зменіць месца жыхарства. А пры самым лепшым варыянце мігрантаў будзе дзесяць працэнтаў», — адзначыў Какорын.

Анамальная спёка выклікала павышаны ціск на сістэмы аховы здароўя многіх краін, СААЗ дапамагае ім распрацоўваць планы па ахове здароўя ва ўмовах павышаных тэмператур, паведаміў генеральны дырэктар арганізацыі Тэдрас Гебрэесус. Паводле яго слоў, у дзяржавах Паўночнага паўшар'я цяпер фіксуюцца экстрэмальна высокія тэмпературы, выкліканыя з'явай надвор'я Эль-Ніньё і змяненнем клімату. «Экстрэмальная спякота ў найбольшай ступені закранае тых, хто менш за ўсё здольны справіцца з яе наступствамі, напрыклад пажылых людзей, немаўлят і дзяцей, а таксама бедных і бяздомных», — заўважыў Гебрэесус.

Кіраўнік СААЗ дадаў, што гарачыня мае розныя наступствы для здароўя чалавека, часта ўзмацняе існуючыя захворванні, а таксама прыводзіць да заўчаснай смерці. Пры гэтым найбольшую пагрозу для ўразлівых груп насельніцтва будуць складаць анамальна высокія тэмпературы ў начны час сутак. Пры спякотным надвор'і з потам вылучаецца вялікая колькасць мінеральных рэчываў, такіх як калій і магній, яны адказваюць за стабільную работу сэрца. Іх дэфіцыт адбіваецца непасрэдна на рабоце сэрца і можа прывесці да павышанай рызыкі ўтварэння тромбаў, а таксама пачашчанага пульсу.

Паводле даных, апублікаваных навуковым часопісам Nature, летась звыш 60 тысяч чалавек у Еўропе памерла з-за экстрэмальнай спякоты — утрая больш, чым меркавалася раней. Паколькі наша планета працягвае награвацца, гэтая колькасць будзе расці з году ў год, папярэдзіў дырэктар Еўрапейскага рэгіянальнага бюро СААЗ Ханс Клюгэ. Паводле яго слоў, хвалі экстрэмальнай спёкі — яшчэ адзін доказ таго, што чалавецтва абавязана прыняць тэрміновыя меры па барацьбе са змяненнем клімату. У той жа час кожны жыхар рэгіёна, які аказаўся ў палоне высокіх тэмператур, павінен паклапаціцца пра сябе і блізкіх, каб пазбегнуць самых сур'ёзных наступстваў для здароўя.

**Захар БУРАК.**

# БАКСЁРСКІ РЫНГ У АМФІТЭАТРЫ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

«Праведзенне II Гульняў краін СНД — вялікая адказнасць для ўсёй вобласці. Мы тое разумеем. І нам падабаецца гэтая ідэя, бо ўсім беларускім рэгіёнам і Віцебшчыне, у прыватнасці, ёсць што паказаць, нам ёсць чым ганарыцца. Хоць гэта, вядома, і своеасаблівы выклік, які мы ацанілі як справу гонару. У нас працуе каманда прафесіяналаў, з намі супрацоўнічаюць федэрацыі па відах спорту. Досвед праведзення міжнародных стартаў таксама маем», — адзначае **Дзяніс ШКІР'ЯНАЎ, намеснік начальніка ўпраўлення спорту і турызму Віцебскага аблвыканкама.**



У жніўні Віцебская вобласць пакажа ўсім сваю сілу ў прамым сэнсе гэтага слова. Тут будуць праходзіць спаборніцтвы па боксе і тайландскім боксе (муай-тай). На спаборніцтвы па боксе, якія прыме Орша, чакаюць 186 чалавек: спартсмены, трэнерскі штаб, суддзі, урачы. Па імянных зяўках праходзяць 133 спартсмены з васьмі краін. На турнір па тайскім боксе ў Віцебск плануюць прыехаць 113 чалавек, з іх 76 — спартсмены, якія прадставяць сем краін. Невялікі лікбез — галоўнае адрозненне тайскага бокса ад звычайнага складаецца ў тым, што ўдары тут наносяцца не толькі кулакамі. Нездарма муай-тай часта называюць боем васьмі канечнасцяў.

«Орша спакойна, па плане рыхтуецца да спаборніцтваў у рамках II Гульняў краін СНД. Правялі тэставыя спаборніцтвы, убачылі пэўныя праблемы, сталі працаваць над іх вырашэннем, вызначыліся з месцам пражывання ўдзельнікаў, пачалі займацца брэндзіраваннем. Тут асаблівых пытанняў няма. Куды складаней рыхтавацца да спаборніцтваў у Віцебску. Горад актыўна рыхтаваўся перш за ўсё да «Славянскага базару». Таму пасля яго заканчэння нам у вельмі сціслыя тэрміны трэба падрыхтавацца да Гульняў», — падкрэсліў Дзяніс Шкір'янаў.

## Выклік, якога не варта баяцца

Віцебск стаў аўтарам адной з самых незвычайных «фішак» II Гульняў краін СНД. У гарадзе аб'ядноўца спорт і культура — спаборніцтвы па тайландскім боксе пройдуць на культавай сцэне Летняга амфітэатра. «Мы крыху перажываем, што не правялі тэставыя спаборніцтвы па тайландскім боксе, усё ж такі Летні амфітэатр для спартыўных падзей пляцоўка незвычайная і нязвыклая. Але, з іншага боку, ёсць значныя бонусы ад «Славянскага базару» — адпрацаваныя ўсе моманты ў плане бяспекі, супрацоўнікі МНС, медыцынскія службы добра ведаюць, як працаваць у амфітэатры. Адразу пасля закрыцця «Славянскага базару» сцэна змяніла сваё аблічча, пачалася ўстаноўка спартыўнага абсталявання», — расказвае Дзяніс Шкір'янаў.

Упершыню ў гісторыі Віцебскага Летняга амфітэатра ён будзе прымаць міжнародныя спартыўныя спаборніцтвы. Да выбару пляцоўкі арганізатары ішлі доўга. Спачатку планавалі правесці спаборніцтвы па тайландскім боксе на пляцоўцы цэнтральнага спартыўнага комплексу. Аднак гэты аб'ект прызначаны, у першую чаргу, для гульнявых відаў спорту, а для адзінаборстваў не зусім падыходзіць. Затым разглядалі кадэцкае вучылішча, на закрытай тэрыторыі якога знаходзяцца і гасцініца, і спартыўная база, і трэніровачная пляцоўка. Але згаданы аб'ект можа змясціць абмежаваную колькасць удзельнікаў. Затое ў Летнім амфітэатры месца хопіць усім, нават яшчэ і застанецца. «Кіраўнік Цэнтра культуры «Віцебск» Глеб Лапіцкі сказаў, што правесці спаборніцтвы пад зводамі амфітэатра — своеасаблівы выклік, якога не варта баяцца. Летні амфітэатр — сучасны аб'ект і пры правільным падыходзе яго можна абсталяваць для спартыўнага мерапрыемства. І такім чынам мы ўпішам яшчэ адну незвычайную старонку ў яго цікавую гісторыю», — адзначае Дзяніс Шкір'янаў.

Цікава, што Летні амфітэатр адпавядае ўсім патрабаванням, якія прад'яўляюцца да арэн II Гульняў краін СНД. Таму абсталяваць яго пад баксёрскі турнір абсалютна рэальна. На сцэне ўстановяць вялікі рынг, адпаведнае абсталяванне ўжо закуплена. На пляцоўцы перад амфітэатрам, у народзе вядомай як «яма», паставяць палаткі для трэнераў і спартсменаў, зробяць месцы для індывідуальных трэніровак. Грымёркі для артыстаў у прынцыпе будуць выконваць свае функцыі — стануць раздзявалкамі. Для тайскага бокса важна добрае асвятленне, з гэтым у амфітэатра дакладна няма ніякіх праблем. «Мы разумеем, што не збяром поўны амфітэатр. Але спадзяёмся, што гледачы ўсё ж такі будуць, бачым цікавасць сярод моладзі. Фінальныя баі мы плануем на вечар, каб прыцягнуць як мага больш людзей і паказаць сапраўднае светлавое шоу», — падкрэслівае Дзяніс Шкір'янаў.

Можна не сумнявацца, што II Гульні выклікаюць цікавасць да тайландскага бокса. Гэты від спорту сёння актыўна развіваецца ў рэгіёне, хоць, вядома, з традыцыйнымі відамі ён пакуль канкураваць не можа. Тым не менш, у дзіцяча-юнацкіх школах вобласці працуюць чатыры аддзяленні, у якіх займаецца 335 чалавек. На Віцебшчыне жывуць і выдатныя прадстаўнікі гэтага віду спорту. Так, галоўным суддзёй спаборніцтваў падчас II Гульняў краін СНД будзе Алег Галавінец, начальнік спартыўнага клуба ВДУ імя Машэрава, суддзя міжнароднай катэгорыі, член Еўрапейскай калегіі суддзяў па тайскім боксе. Віцебскі спартсмен Кірыл Вараб'ёў двойчы станавіўся бронзавым прызёрам чэмпіянату свету па тайскім боксе. Планаваў выступіць і на II Гульнях краін СНД, але планы перакрэсліла траўма. Муай-тай для беларускай аўдыторыі — пакуль не самы знаёмы від спорту, але і «тэра інкогніта» яго назваць нельга. У 2017 годзе у Мінску прайшоў чэмпіянат свету, які сабраў больш за 700 спартсменаў са ста краін. У нашай краіне трэніруецца шмат выдатных байцоў, многія з якіх — чэмпіёны свету. Можна не сумнявацца, што ў Беларусі маглі б быць і алімпійскія чэмпіёны, калі б тайландскі бокс быў алімпійскім відам. А пакуль гэты незвычайны від адзінаборства набірае сваю папулярнасць у нас. Гульні краін СНД стануць добрай дадатковай пляцоўкай для яго папулярызацыі.

## Баявая практыка не перашкодзіць

